Прыклад з іншых ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Юрка Астапчук ☞ 4

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 45 (2687) Год LII | Беласток, 11 лістапада 2007 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

З беларускім словам і песняй

Аляксей МАРОЗ

IV Мастацкія сустрэчы школьнікаў, якія 4 лістапада праходзілі ў Музеі і асяродку беларускай культуры, чарговы раз сталі для гайнаўскіх вучняў добрай нагодай выступіць з беларускімі пастаноўкамі, песнямі і вершамі перад сябрамі, бацькамі і гарадской публікай. Спатканне актыўных дзетак і моладзі амаль з усіх гайнаўскіх школ дало магчымасць паказаць поспехі, якіх вучні дабіліся на разнародных конкурсах, выступаючы на роднай мове. Частка маладых людзей на лістападаўскае мерапрыемства падрыхтавала новы рэпертуар, з якім пасля будуць выступаць перад школьнай публікай.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Тэатральныя здольнасці паказалі белліцэісты са школьнага тэатра „Драма" (на першым плане іх апякун, настаўнік Ян Карчэўскі, вядучы мерапрыемства)

Першымі перад гайнаўскай публікай займальна выступілі белліцэісты і белгімназісты. „Знічка" запрэзентавалася ў новым складзе, але заспявала старую песню з кампакт-дыска „Пульс хвіліны", які з'явіўся летам і змяшчае ў сабе рэпертуар апошніх трох гадоў.

— Зараз на 10 асоб у „Знічцы" спяваюць 4 дзяўчаты з папярэдняга складу. Аднак камплектаванне новага складу яшчэ не закончылася, але я думаю, што пад Агляд праваслаўных калядак набор у наш калектыў закончыцца, — заяўляе Бажэна Ляўчук, апякунка „Знічкі". — Песня „Доля", якую сёння запрэзентавалі нашы дзяўчаты, з'яўляецца першай на новым кампакт-дыску і была яна адначасна рэкламай гэтага дыска. З творамі, што спяваў наш гімназічны калектыў, занялі мы другое месца на Конкурсе беларускай песні.

Настаўнік беларускай мовы Гайнаўскага белліцэя і заадно намеснік старшыні Аб'яднання „Музей і асяродак беларускай культуры" Ян Карчэўскі, які вёў мерапрыемства і ў галоўным займаўся яго падрыхтоўкай, звярнуў увагу на дэбют новага музычнага гурту з яго школы. Гайнаўскія белліцэісты пад гарачае апладзіраванне сваіх сяброў і моладзі з іншых школ праспявалі беларускую песню і прэзентавалі інструментальную музыку. Тэатральная група з белліцэя, якой апякуецца Ян Карчэўскі, выступіла з інсцэніроўкай драмы збудаванай на народных матывах. Сабраныя маглі паглядзець на тэатральныя здольнасці вучняў, за якімі з-за сцэны сачыў іх апякун. Белгімназісты II „б" класа ўдала выступілі з інсцэніроўкай „Прыйшлі Пакровы, ці да зімы гатовы?"

— Мы любім спяваць і выступаць перад публікай. Падрыхтавалі мы абрад спецыяльна на сустрэчы, але можа будзем таксама паказваць яго ў сваёй школе, — кажуць белгімназісткі з II „б" класа Дар'я Жарначук і Эмілія Шэшка.

— Пры нагодзе розных святаў мы рыхтуем абрады, спалучаныя з імі, — кажа настаўніца дзяўчат Вольга Сянкевіч і на пытанне пра зацікаўленні яе вучняў пачынае расказваць пра артыкулы ў „Ніве", якія чытаюць гайнаўскія белліцэісты і белгімназісты. — Вучні белліцэя цікавяцца ўжо палітычнымі справамі, што адбываюцца ў Беларусі, а гімназісты пачынаюць агляд „Нівы" з крыжаванкі і артыкулаў у „Зорцы".

Інсцэніроўку „Вясковыя забавы" падрыхтавалі вучні першага класа Гімназіі н-р 2. Цікава прэзентвавалі яны „вясковыя размовы", што былі рэжысіраваныя разам з настаўніцай Людмілай Грыгарук, беларускія песні і танцы. Пасля выступаў настаўніца паінфармавала, што менавіта гэтыя вучні асабліва любяць гаварыць пра вясковыя традыцыі.

— Наш рэпертуар мы падрыхтавалі спецыяльна на мастацкія сустрэчы. Штогод мы выступаем з іншымі сцэнкамі, але заўсёды звяртаем увагу на фальклор і нашы рэгіянальныя справы, — кажа настаўніца Гімназіі н-р 2 Людміла Грыгарук. Настаўніца беларускай мовы з Падставовай школы н-р 6 Бэата Кендысь прыехала з расказчыкамі, якія ўдала ў мінулым школьным годзе выступілі на гавэндзярскім конкурсе. Іх рэпертуар, так як і пазнейшыя дэкламацыі вучняў, падабаліся малодшай і старэйшай публіцы.

— Мы найчасцей рыхтуем на мастацкія сустрэчы новы рэпертуар, — заяўляе настаўніца Аліна Новік з Пачатковай школы н-р 5, вучні якой падрыхтавалі на мерапрыемства многа вершаў. Настаўніца беларускай мовы з Пачатковай школы н-р 2 Аліна Якімюк гаворыць пра козыры мастацкіх сустрэч, у час якіх яе дзеткі могуць прадставіць творы, з якімі яны выступалі, а некаторыя і дабіліся поспехаў на беларускамоўных конкурсах. У гэтым годзе прывезла яна ў музей дэкламатараў мінулагодняга конкурсу. Усе індывідуальныя выступы дзетак і моладзі былі цікавымі на свой спосаб, але добра, што арганізатары мерапрыемства, якімі былі ўправа Аб'яднання „Музей і асяродак беларускай культуры" і дырэкцыя Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, не паставілі на масавую дэкламацыю, бо яна рабілася б тады нуднай, а песні і інсцэніроўкі ўводзілі новы подых.

У час музейнага мерапрыемства можна было не толькі паглядзець на цікавыя выступы дзетак і моладзі, але і пагаварыць пра навучанне беларускай мовы ў гайнаўскіх школах. Мае суразмоўцы інфармавалі, што колькасць дзетак, якія вучацца роднай мове, трымаецца ў іх школах на ўзроўні падобным да мінулагодняга або, на жаль, меншае (не бяру пад увагу Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы, дзе ўсе вучні вучацца па-беларуску). На асаблівую ўвагу ў Гайнаўцы заслугоўвае невялікая Пачатковая школа н-р 3, распаложаная ў квартале Юдзянка. Там амаль усе дзеткі вучацца па-беларуску.

— У трэцім класе, які сёння выступаў перад гайнаўскай публікай, усе дзеткі ходзяць на заняткі беларускай мовы. У іншых класах вучацца па-беларуску таксама праваслаўныя і каталікі. Толькі па адным або двое дзетак на клас не ходзяць на заняткі беларускай мовы, — тлумачыць настаўніца Марыя Крук.

Змаганне за памяць ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Восень абвастрыла грамадзянскія супярэчнасці ў беларускім грамадстве. Бальшыня насельніцтва краіны гэтага зусім не адчувае, таму што знешне не здараецца нічога надзвычайнага — у крамах усё ёсць, цягнікі і аўтобусы ездзяць па маршрутах, дамы не ўзрываюцца, на вуліцах не страляюць (і дзякуй Богу!)...

Усходняя мяжа ☞ 5

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Што зрабіць, каб усходняя мяжа Еўрасаюза, значыць, і Польшчы, была прыязнай, але і бяспечнай пасля ўваходу новых членаў ЕС у зону Шэнген, — абмяркоўвалі ўдзельнікі Грамадзянскага форуму „Еўрасаюз адкрыты і бяспечны", сарганізаванага ў Беластоку Інфармацыйным бюро Еўрапарламента і Інстытутам публічных спраў...

Арлянскі музыка ☞ 8

Міхал МІНЦЭВІЧ

Мы будзем тут ... ☞ 10

Віктар САЗОНАЎ

Лёс гулякі ☞ 11

(івар)

9 770546 196000

Змаганне за памяць

Восень абвастрыла грамадзянскія супярэчнасці ў беларускім грамадстве. Бальшыня насельніцтва краіны гэтага зусім не адчувае, таму што знешне не здараецца нічога надзвычайнага — у крамах усё ёсць, цягнікі і аўтобусы ездзяць па маршрутах, дамы не ўзрываюцца, на вуліцах не страляюць (і дзякуй Богу!). І ўсё ж не пакідае адчуванне ні больш, ні менш як грамадзянскай вайны. Вайны, якую вядзе з народам сённяшняя ўлада. І змаганне ідзе перадусім за гістарычную памяць. З аднаго боку нацыя высілкамі грамадска-палітычных актывістаў імкнецца ўстаць з калень, скінуць шматвяковае каланіяльнае ярмо, вярнуць людзям праўду і назваць усе рэчы сваімі імёнамі: «освободителей» з усходу — чарговымі акупантамі, мясцовых савецка-камуністычных „деятелей" — калабарантамі, сталіншчыну — жахлівым часам панавання на зямлі сатанінскіх парадкаў. З іншага боку дзяржава культывуе вобраз светлага вольнага часу перыяду існавання СССР, імкнецца вярнуць скрозь фальшывую ідэалогію. Мясцовыя „спірытысты" навязліва выклікаюць прывід крывавага Сталіна і адраджаюць культ злачыннага НКВД-КГБ.

Грамадскі аргкамітэт ушанавання памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсій абвясціў 2007 год — Годам памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсій у Беларусі, а 29 кастрычніка — Днём памяці. Якраз сёлета спаўняецца 70 гадоў з страшнага 1937-га — найбольшага размаху рэпрэсіяў, а 29 кастрычніка 1937 года адбыліся масавыя расстрэлы беларускай інтэлігенцыі. Аднак улады прадказальна не далі дазволу на правядзенне ва ўрочышчы Курапаты мітынгу-рэквіему. Спроба арганізацыі ў Мінску Форуму „У будучыню — без камунізму" наткнулася на адмову ў арэндзе належнага памяшкання. Мерапрыемства павінна было адбыцца ў куды меншым маштабе. Затое на запрашэнне ўладаў у нашу сталіцу на дзень бальшавіцкай рэвалюцыі з'ехаліся камуністы з усёй постсавецкай прасторы, якія за кошт беларускіх падаткаплацельшчыкаў будуць балявацьна поўную катушку.

А ў Віцебску ўдзельнікі акцыі памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсій былі затрыманыя, некаторых з іх аштрафавалі, у тым ліку і за бел-чырвона-белыя сцягі. Для сённяшняй улады саме страшнае — гэта наш нацыянальны сцяг, за яго ўздыманне звычайна даюць найбольшыя штрафы. У Беларусі міліцыя пераўтворана зараз у „паляўнічых на людзей", не важна якая адбываецца грамадская акцыя — хапаюць усіх і ўсюды: ад Дзядоў — да Хэлоўіна. Агідна, што гэтыя загады выконваюцца, прычым паводле страху выканаўцаў. Як сцвярджаў несмяротны герой булгакаўскага рамана „Майстар і Маргарыта" (днямі аднайменны фільм якраз дэманструецца на экранах), „найбольш страшным з усіх чалавечых заганаў ёсць страх". Бо страх нішчыць годнасць чалавека, разбурае яго асобу.

Хроніка апошняга тыдня яскрава засведчыла, што рэжым, які цяпер пануе ў Беларусі, у дадатак да метадаў запалохвання і саджання ў турмы невінаватых, адкрыта пераходзіць да фізічных расправаў з іншадумцамі. У Магілёве апоўначы на выхадзе з пад'езда дому групай стрыжаных бандытаў былі моцна збітыя два юнакі з мясцовай суполкі „Моладзі БНФ". Тое, што іх збівалі не звычайныя рабаўнікі, пацвярджае той факт, што ў пацярпелых не забіралі ні грошай, ні мабільных тэлефонаў. А ў канцы бандыты „пад страхам смерці" забаранілі хлопцам звяртацца ў міліцыю. Хоць наўрад ці яны туды і звярталіся б — міліцыі ў нашых людзей даўно няма даверу.

За тыдзень да Дня памяці паўстанцаў 1863 года, які па традыцыі прайшоў на Гродзеншчыне ў Свіслачы, правакатары справакавалі грамадскага лідэра Анатоля Валюка на бойку, вынік зразумелы — паэт і грамадскі актывіст атрымаў 15 сутак арышту і не змог удзельнічаць у мерапрыемстве, за якім па пятах хадзіла міліцыя. А ў Віцебску 18-гадовага сына аднаго з сябраў Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ позна ўвечары збілі двое невядомых. Ян Дзяржаўцаў мяркуе, што напад на ягонага сына верагодна зрабілі тыя, хто ў жніўні гэтага года даслалі яму ліст з пагрозамі ад імя незарэгістраванай арганізацыі Русское национальное единство — відавочна фашыстоўскай арганізацыі. Зразумела, што вінаватыя знойдзены не будуць.

Усё гэта не кіношныя страшылкі, а рэаліі. А нататкі гэтыя адрасаваны перадусім тым чытачам „Нівы", якія маюць ілюзіі наконт парадкаў, што пануюць у сённяшняй Беларусі. Хто не верыць, хай прыязджае сам і пераканаецца.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Працягласць і настрой

Наша традыцыя любіць прадстаўляць восень як пару заняпаду, прадвесце канца, дэкадэнцтва; пару меланхоліі ці — як сёння сказалі б па-сучаснаму — пару дэпрэсіі. Немцы кажуць Weltschmerz на стан смутку, прыгнечанасці, знеахвочання па прычыне недасканаласці свету, у якім нам прыйшлося жыць. Заядлыя меламаны сцвярджаюць, што гэткаму стану духа адпавядае музыка Іагана Брамса, музыка вечара, пагасання і прамінання ўсялякіх з'яў.

Што ж гэта такое традыцыя: яна спадчына, захоўваны скарб, каб яго далей перадаць свавольнікам-патомкам? Ужо ж модныя постмадэрныя ідэі прапануюць вызваленне ад багажу мінулых падзей, засыпанне бяздоння памяці, патрабуюць новых народзін з нічога. Уся спадчынная культура нашай старой Еўропы паводле дзеячаў контркультуры гэта невыносны горб, баласт, можа, крыніца пакут, як казаў Фрэйд. А, можа, з'явы культуры гэта раскошныя, рафінаваныя творы, якія служаць адно да казытання надта далікатных нерваў прадстаўнікоў вышэйшых класаў эксплуататараў, крыўдзіцеляў.

Бачыцца, што 1968 год, год зрыву моладзі, асабліва тае, што тады адукавалася, студэнцкай, чаго сімвалам былі барыкады парыжскага мая, быў можа важнейшым, больш гучным па выніках у гісторыі Еўропы, чым дзве вялікія рэвалюцыі, тая французская 1789 і тая расійская 1917 года. Пасля 1968 года сталі мы сведкамі заняпаду класічнай культуры, таксама і высокага мастацтва, а новыя з'явы, якія еўрапейскую культуру выцясняюць, адпіхваюць у нябыт, супрацьставяцца ёй як контркультура, неабавязкова вартыя бязмежнага дзівавання і пераймання.

З часу маёй маладосці памятаю настроі ўсёахопнага аптымізму, хоць чымсьці іншым быў казённы аптымізм афіцыйна прапаведаваны ў краінах рэальнага сацыялізму, які пільна сцераглі з'яднаныя сілы яўнай і тайнай паліцыі. (Памятаю лозунг: сацыялізм гэта рай на Зямлі, мусім толькі Захад дагнаць і адагнаць. Дык чым жа быў той гонены Захад, калі рэальны сацыялізм быў ужо раем?). Аптымізмам напаўняў таксама неверагодны прагрэс, здавалася б, неабмежаванае развіццё навукі і тэхнікі. У культавым фільме з 1968 г. Стэнлі Кубрыка „2001: касмічная Адысея" ў 2001 г. чалавецтва заваёўвала далёкі космас, з базаў на Месяцы стартавалі суперхуткія касмічныя караблі, героі фільма карысталіся незвычайнымі, вычварнымі прыладамі і да г.п. Касмічны карабель разам з чалавечым экіпажам плаваў у бяскрайнім прадонні, а таму ўсяму спадарожнічалі незвычайныя псіхічныя адчуванні, прывіды, галюцынацыі, пераскокі ў часе.

Сёння нам здаецца, што той аптымізм быў ілюзіяй, быў заўчасны, паколькі ў III тысячагоддзі ўсё няма ў нас танных крыніц энергіі, атамістыка, здаецца, спынілася на месцы, а залежы сыравін на Зямлі канчаюцца. Цывілізацыя паслясучаснасці вырабляе адно новыя прадметы раскошы, бліскучкі, фінціклюшкі, нейкія вычварныя тэлефоны, камп'ютэры і інтэрнэты, якія служаць адно для запаўнення вольнага часу, для забеспячэння ад нудотнай экзістэнцыі, для палёгкі руху рэчаў сённяшняга часу.

Не магу пазбыцца ўражання, што модная контркультура прапануе лёгкую мадэль творчасці, увогуле халтуру, беспраблемнасць, дзе няважнае майстэрства падмацаванае ведамі і працай, высілкам і творчымі пакутамі. У паслясучаснасці быццам бы кожны просты смертны можа быць маэстра, хай і на пяць хвілін. Усе правакацыі контркультуры, хепенінгі, параксізмы бунту і знішчання маюць за падставу лёгенькі быт, паколькі нарадзіліся ў краінах, дзе грамадзяне не пакутуюць ад матэрыяльных турбот, не прыгнечаны штодзённым, нэндзай, голадам.

Выстраліць кулю са смертаноснай вінтоўкі сёння роўна проста, як націснуць кнопку камп'ютэра. Ды ўсё ж з'яўляюцца праблемай пакуты ад станаў дэпрэсіі і нуды. Як забыцца на цень, які цікуе за тваёй спіной?

Здаецца, іудзея-хрысціянская мудрасць непераўзыдзена, калі пачатак кожнай рэфлексіі, калі ўпэўненасць, абгрунтаванне кожнага людскога жыцця выводзіцца з пачуцця дабрыні і красы стварэння. Мудрэц Лейбніц не без дайпрычыны палічыў наш свет найлепшым з магчымых. У гомане і крыку, якія маюць заглушыць неспакой, сумніў, недахоп мэты, як жа часта выбіраем мы падарожжа ў нікуды як наркатычны транс, пагружэнне ў ашаламленне, у забыццё.

Наша жыццё ні салодкае, ні горкае, а тыя прарокі, што абяцаюць дасягненне райскіх краін, пад анёльскай маскай скрываюць твар пустэчы і нігілізму.

Рытм жыцця гэта таксама адвечныя перамены пораў года. Надзея гэта зменлівасць; пастаяннымі з'яўляюцца толькі матэматычныя аксіёмы.

Ежы ПЛЮТОВІЧ

Вачыма еўрапейца

Аб узнагародах

„Свабода думкі — адзіная гарантыя ад заражэння людзей масавымі міфамі, якія ў руках вераломных крывадушнікаў-дэмагогаў лёгка ператвараюцца ў крывавую дыктатуру", — гэтыя словы ў свой час сказаў Андрэй Сахараў (1921-1989), расійскі ядзерны фізік, дысідэнт, лаўрэат мірнай Нобелеўскай прэміі (1975), змагар супраць правапарушэнняў асноўных правоў чалавека ў зняволеным камунізмам брэжнеўскім СССР.

Я прыгадаў яго нядаўна, калі ў канцы кастрычніка, у цяні медыйных паслявыбарчых падзей у Польшчы, Еўрапарламент назначыў узнагароду яго імя змагару за свабоду ідэі суданскаму адвакату Саліху Махмуду Осману. У Страсбургу будзе яна яму ўручана 11 снежня. Я пачаў прытым біцца ў грудзі за адзін з тэкстаў у гэтай рубрыцы, калі ўспамінаў, што свет-Еўропа забываецца не толькі аб Беларусі, але і аб іншых краінах, дзе парушаюцца правы чалавека, сярод іх і ў Судане. Таму калі дайшла да мяне інфармацыя аб сёлетняй узнагародзе імя А. Сахарава „За свабоду думкі", стаў я сам старацца даведацца, хто гэта такі той Саліх Махмуд Осман. Даю руку за тое, мае дарагія, што і Вы не маеце ўявы, аб кім гаворка. Таму вось дзялюся з Вамі тым, чаго я даведаўся аб ім. Саліх Махмуд Осман супрацоўнічае з Суданскай арганізацыяй супраць катавання. Ад 20 гадоў прадстаўляе перад судамі пацярпеўшых у час крывавай разні — грамадзянскай вайны, а таксама ахвяры правапарушэнняў у суданскай правінцыі Дарфур, і да таго не бярэ за гэта грошай. Тры гады таму яго зняволілі без судовага разбору і прысуду. Частку ягонай сям'і выразалі. Пасля інтэрвенцыі міжнародных арганізацый быў вызвалены. У час агучання рашэння ЕП аб назначэнні яму ўзнагароды Ганс-Герт Пётэрынг, старшыня Еўрапарламента, сказаў:

— Назначаючы ўзнагароду Саліху Махмуду Осману, ЕП дэманструе сваю падтрымку для дзеянняў гэтага адважнага чалавека, які стаў голасам Дарфура ды для ўсталявання прававой дзяржавы ў Судане.

Варта пры гэтай узнагародзе прыгадаць, што лаўрэатам узнагароды імя А. Сахарава (якая назначаецца з 1988 г.) быў летась Аляксандр Мілінкевіч, у 2005 г. кандыдат у прэзідэнты Беларусі ад аб'яднаных дэмакратычных сіл. ЕП у гэты спосаб — як тады было заяўлена ў афіцыйным камюніке — выказаў „непахіснае забавязанне спадарожнічаць Беларусі ў працэсе пошукаў гэтай краінай шляху да дэмакратыі ды поўнага ўдзельніцтва ў жыцці свабоднай і задзіночанай Еўропы".

Пішу так Вам аб узнагародзе А. Сахарава і яе апошніх лаўрэатах і думаю, чаму яшчэ не час на іншую ўзнагароду для беларуса, мірную Нобелеўскую прэмію. Наколькі ведаю, да яе заяўлены ўжо быў змагар за правы чалавека ў Беларусі Алесь Бяляцкі, а да апошняга выпуску — старшыня незалежнага беларускага парламента першых дзевяностых гадоў Станіслаў Шушкевіч (падаў заяву іншы лаўрэат гэтай узнагароды — Лех Валэнса). Ну, што ж, пачакаем да кастрычніка будучага года, да „раздачы" чарговых Нобелеўскіх прэмій.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

PS. Прачытаў я ў апошнім штомесячніку „Czasopis" фельетон Сакрата Яновіча, у якім напісаў ён наступнае: „Бачу цяпер дзіва дзіўнае: беларускімі патрыётамі пачынаюць быць не беларусы — у саветаў расейцы, а ў палякаў самі палякі. Чытаючы «Ніву» вачам сваім не веру, што найбольш патрыятычныя беларускія тэксты напісаныя зусім не беларусамі". Тут спадар Сакрат пералічыў і маё прозвішча. Тлумачу Вам, спадар Яновіч, так як ужо я калісь рабіў, тлумачыўшы Пасольству Беларусі ў Варшаве на старонках „Нівы". Я з'яўляюся тым, кім сябе адчуваю. Так вось: час ад часу фактычна палякам, але ўжо ад гадоў штораз больш беларусам, тым з Брысевічаў, Стэфанчукоў.

М. Х.

Расследаванне „Нівы"

Узяць нам прыклад з іншых

Аляксей МАРОЗ

У размове з раднымі гмін Гайнаўскага павета і чыжоўскім войтам у справе магчымасцей увядзення двухмоўных назваў мясцовасцей на дарожных указальніках і беларускай мовы ў якасці дапаможнай у кантактах з работнікамі гмінных самаўрадаў („Ніва" № 41) паяўляліся выказванні, што рады гмін і іх жыхары не падтрымаюць ідэі фінансавання новых указальнікаў за сродкі гмінных бюджэтаў. Каб даведацца пра палітыку гмінных улад у дачыненні да нацыянальных меншасцей і высветліць за якія сродкі фінансуюць яны ўказальнікі з двухмоўнымі назвамі мясцовасцей, дзе жывуць немцы і літоўцы, паразмаўляў я з войтамі гмін на Апольшчыне і войтам гміны Пуньск, дзе радныя ўжо прагаласавалі за ўвядзенне двухмоўных назваў мясцовасцей. Нямецкія, літоўскія і польскія радныя згодна ўводзяць там еўрапейскія стандарты сужыцця паміж палякамі і нацыянальнымі меншасцямі, выказваючы такім чынам пашану да гэтых меншасцей і іх моў.

Рада гміны Пуньск у гэтым годзе прыняла пастанову ў справе ўвядзення двухмоўных назваў мясцовасцей (на польскай і літоўскай мовах) на дарожных указальніках. Улады гміны чакаюць дазволу Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі ставіць новыя ўказальнікі.

— Ужо ў пастанове былі зроблены запісы наконт грамадскіх кансультацый у справе новых указальнікаў. У час вясковых сходаў, калі мы якраз выбіралі солтысаў, арганізавалі апытанне жыхароў нашай гміны. Спыталі мы іх: „Хто падтрымлівае ўвядзенне двухмоўных назваў на дарожных указальніках, хто ёсць супраць, а хто ўстрымаўся ад галасавання?" Трэба, каб на сходзе ў час першай сустрэчы ў справе апытання прысутных было прынамсі 50% жыхароў сяла, але калі не было кворуму, мы згодна з пастановай нашай Рады гміны чакалі трыццаць хвілін і адкрывалі другую сустрэчу. Тады галасавалі прысутныя на сходзе. Пасля кансультацый аказалася, што на 33 мясцовасці толькі 3 вёскі ў нашай гміне будуць без двухмоўных указальнікаў. Гэтыя тры мясцовасці ўстрымаліся ад увядзення новых прапаноў, але я думаю, што калі людзі з гэтых сёл пабачаць прыгожыя ўказальнікі ў суседніх вёсках, то схочуць таксама паставіць іх на акраінах сваіх мясцовасцей. У трыццаці населеных пунктах людзі аднагалосна прынялі ўвядзенне двухмоўных назваў вёсак на ўказальніках, — расказвае Вітальд Лішкоўскі, войт Пуньскай гміны. — Пасля кансультацый быў зроблены каштарыс выканання і размяшчэння новых указальнікаў і разам з усімі дакументамі перадалі мы яго падляшскаму ваяводу. Цяпер ужо ўсе дакуметы знаходзяцца ў Міністэрстве ўнутраных спраў і адміністрацыі і адтуль чакаем адказу. У самім Пуньску няма яшчэ ўказальнікаў з назвамі вуліц і напэўна мы рашымся ўвесці двухмоўныя назвы вуліц, але за гэтыя ўказальнікі будзем ужо плаціць з гміннага бюджэту.

Фота Аляксея МАРОЗА

Адкрытым астаецца пытанне ці хутка на акраінах Гайнаўкі паявяцца двухмоўныя назвы горада

Новыя ўказальнікі за сродкі дзяржбюджэту

У час перапісу насельніцтва ў Пуньскай гміне 77% жыхароў назвала сябе літоўцамі (усё ж менш прадстаўнікоў нацыянальнай меншасці, чым у Чыжоўскай ці Дубіцкай гмінах). Аказваецца, што ўсе гміны, дзе жыве прынамсі 20% прадстаўнікоў нацыянальнай меншасці могуць разлічваць на ўстанаўленне новых дарожных указальнікаў з двухмоўнымі назвамі мясцовасцей за сродкі дзяржаўнага бюджэту, аб чым не былі інфармаваныя або інфармаваныя павярхоўна многія радныя гмін, дзе жывуць беларусы.

— Прадпрыемства, якое выконвае ўказальнікі, зрабіла нам каштарыс і вылічыла, што ўсе выдаткі звязаныя з новымі ўказальнікамі ў нашай гміне складуць каля васьмідзесяці тысяч злотых. Згодна з законам аб нацыянальных меншасцях, гэта з дзяржаўнага бюджэту фінансуецца купля і ўстаноўка новых указальнікаў і мы будзем рэалізаваць нашую інвестыцыю за дзяржаўныя сродкі, — тлумачыць войт Вітальд Лішкоўскі. — Рашаючыся на новыя ўказальнікі з польскімі і літоўскімі назвамі мы звярталі ўвагу перад усім на духовыя вартасці, звязаныя з доўгай гісторыяй нашага пражывання на гэтых землях і мелі на ўвазе ўмацаванне нацыянальнай свядомасці сярод літоўцаў. Для турыстаў цікавымі будуць двайныя назвы, а для мясцовых жыхароў павінны спадабацца новыя прыгожыя ўказальнікі. Зараз няма ніякіх эмоцый вакол прапановы ўстанавіць новыя ўказальнікі. Для людзей было нармальным, што калі паявілася такая магчымасць, трэба ёю пакарыстацца. Можа, калі паставяць новыя ўказальнікі, будуць нейкія выказванні аб новых інвестыцыях, але зараз і палякі, і літоўцы выказваюцца за новыя прапановы.

Раней радныя Пуньскай гміны прагаласавалі за ўвядзенне літоўскай мовы ў якасці дапаможнай у кантактах з работнікамі гміннага самаўрада.

— Жыхары нашай гміны размаўлялі з гміннымі чыноўнікамі па-літоўску перад тым, як мы прынялі пастанову аб дапаможнай мове, і надалей так размаўляюць. Аднак цяпер усё адбываецца згодна з абавязваючымі ў Польшчы законамі. Яшчэ не было выпадкаў, каб жыхары гміны пісалі да нас прашэнні па-літоўску, але прыходзяць да нас пісьмы з Літвы на літоўскай мове і мы іх трымаем у арыгінале ў нашых архівах. Жыхары нашай гміны маглі б выступаць да нас з пісьмовымі прашэннямі па-літоўску ва ўнутраных справах гміны, але не робяць гэтага, бо звяртаюцца да нас найчасцей з вуснымі просьбамі і мы іх афармляем, — кажа войт Вітальд Лішкоўскі.

Вітальд Лішкоўскі

Чарговым маім суразмоўцам быў войт гміны Тарнаў-Апольскі Зыгмунт Ціхань. У гэтай гміне ўказальнікі на польскай і нямецкай мовах хочуць паставіць ва ўсіх мясцовасцях.

— Ажно 5-6 гадоў мы змагаліся за ўстанаўленне новых інфармацыйных дошак на будынку гміннай установы і недзе год таму павесілі такія шыльды. Надпіс па-нямецку „Гмінная ўстанова Тарнаў-Апольскі" зроблены на фоне іншага колеру, чым надпіс па-польску і нямецкія словы напісаны меншым шрыфтам. У нас уведзена таксама дапаможная нямецкая мова ў кантактах з нашымі працаўнікамі, хочам таксама паставіць указальнікі на польскай і нямецкай мовах на акраінах мясцовасцей, — заяўляе войт Зыгмунт Ціхань. — Не ўводзім двайных назваў вуліц, бо не было б сэнсу па-нямецку пісаць назву вуліцы Адама Міцкевіча, і не рашыліся выбіраць паасобных вуліц да двайных названняў.

Без грамадскіх кансультацый

Рада гміны Тарнаў-Апольскі яшчэ вясной прыняла пастанову ў справе двухмоўных указальнікаў. Улады гміны былі першымі, якія рашыліся ўвесці новыя ўказальнікі без грамадскіх кансультацый.

— Мы маем намер рэалізаваць пастанову ў справе новых указальнікаў без грамадскіх кансультацый. Была зроблена юрыдычная экспертыза, якая паказвае, што неабавязкова праводзіць грамадскія кансультацыі ў справе ўвядзення двухмоўных назваў мясцовасцей на дарожных указальніках. У некаторых гмінах Апольшчыны былі праведзены кансультацыі, а ў іншых іх спынілі. У тых гмінах, дзе спыніліся кансультацыі гавораць, што формула, якую мы прынялі, лепшая ад той з кансультацыяй і хочуць ісці працертай намі дарогай, — тлумачыць войт Зыгмунт Ціхань. — У адной гміне ўжо размешчаны двухмоўныя ўказальнікі.

Аднак улады гміны Тарнаў-Апольскі мусілі яшчэ пераканаць польскія дзяржаўныя ўлады, што кансультацыі неабавязковыя для ўстанаўлення новых указальнікаў з назвамі мясцовасцей па-польску і па-нямецку.

— Спачатку ваявода націскаў на нас, каб мы праводзілі грамадскія кансультацыі ў справе ўказальнікаў, але былі зроблены чарговыя экспертызы і ўлады нямецкай нацыянальнай меншасці не раілі нам праводзіць грамадскіх кансультацый. У ваяводы не хацелі даць станоўчай ацэнкі нашаму прашэнню наконт указальнікаў, складзенаму разам з іншымі дакументамі, але згадзіліся пераслаць яго ў Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі. У ліпені міністэрства тэлефанічна паведаміла мяне, што ўступна нашае прашэнне адобрана. Міністэрскія чыноўнікі хацелі яшчэ, каб мы папоўнілі і паправілі нашы дакументы. Пазней мы з міністэрства атрымалі інфармацыю, што наша прашэнне зацверджанае. Не атрымалі мы аднак яшчэ такой пастановы пісьмова, — падрабязна расказвае войт Зыгмунт Ціхань. — Згодна з нашым каштарысам за новыя ўказальнікі павінны вярнуць нам з дзяржаўных сродкаў каля 60 тысяч злотых.

(працяг праз тыдзень)

Культурны абмен

Гэтай восенню фальклорныя калектывы „Цаглінкі” і „Нараўчанкі” з Нараўчанскай гміны пабывалі ў Пружанах на Беларусі. Паехалі яны туды ў рамках прыгранічнага праекта „Традыцыя і будучыня” на сродкі Еўрарэгіёна „Белавежская пушча”.

„Нараўчанкі” і „Цаглінкі” сустрэліся з ансамблем „Вербніца” ў Палацы культуры ў раённым горадзе Пружаны. Абменьваліся песнямі, танцамі і традыцыяй. Па дарозе дамоў нашы калектывы выступілі з канцэртам у мясцовасці Роўбік недалёка дзяржаўнай мяжы. Мясцовая публіка сардэчна ўспрыняла гасцей з Польшчы. Нашы спявачкі частавалі беларускіх дзетак шакаладнымі цукеркамі. Перад ад’ездам гаспадары наладзілі багатае застолле, на якім не забракла свойскіх смакавітых вырабаў. Усё дзеля таго, каб квітнела дружба і культурны абмен.

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Для невідучых

27 кастрычніка г.г. у Гайнаўскім доме культуры (ГДК) прайшло святкаванне Дня белай палачкі. Павятовы гурток Польскага саюза невідучых (ПСН) налічвае 110 членаў. У святкаванні прыняло ўдзел каля 60 асоб.

Найперш адбыўся паказ навейшых дапаможных прыладаў для невідучых. З канцэртам выступілі юныя артысты ГДК — спевакі і танцоры. Канцэрт усім спадабаўся. Пасля мастацкай часткі быў салодкі пачастунак.

Сустрэчу і канцэрт для невідучых ладзілі члены новавыбранага праўлення гуртка ПСН Януш Пух — старшыня, Ян Целушэцкі — намеснік старшыні і Мікалай Янкоўскі — сакратар. Не абышлося без дапамогі сімпатычных і добразычлівых валанцёраў з Гайнаўкі. **(мох)**

Пенсіянеры

25 кастрычніка г.г. адбыўся справаздачна-выбарчы сход Раённага аддзела Польскага саюза пенсіянераў (ПСП) у Нараўцы, аднаго з найактыўнейшых у Падляшскім ваяводстве. Зараз гэтая гмінная пенсіянерская арганізацыя налічвае 337 членаў. ПСП дапамагае старэйшым людзям, м.інш. у тым, каб не пражывалі яны свой век у самоце ды каб як найдаўжэй не дапускалі да сябе старасці. Праўленне аддзела ПСП арганізоўвае ім цікавыя культурна-забаўляльныя мерапрыемствы м.інш. сяброўскія вечарыны з песняй, музыкай і танцамі, краязнаўчыя экскурсіі. Нядаўна адбылося святкаванне Дня сеніёра, а ўжо рыхтуюцца да „Андрэйкаў”.

Нараўчанскай пенсіянерскай арганізацыі дапамагаюць гмінныя ўлады, спулдзельчы банк у Нараўцы, керамічная фабрыка ў Старым Ляўкове і надлясніцтва Броўск.

У склад новага праўлення ПСП у Нараўцы ўвайшлі: Ядвіга Карпюк (старшыня), Стэфанія Грыка (намеснік старшыні), Люцына Зданоўская (сакратар), Аляксандра Конкель (скарбнік), Яўген Смольскі (член праўлення) ды Ян Целушэцкі, Яўген Валкавыцкі, Павел Леўша, Мікалай Варанецкі (выбраныя ўпершыню члены праўлення). Рэвізійную камісію састаўляюць: Юрый Тамберг (старшыня), Антон Енсла і Ірэна Ігнатовіч. Дэлегатам на ваяводскі з’езд ПСП выбралі Ядвігу Карпюк. **(ян)**

Культура ў Гарадку

Размова з дырэктарам Гміннага цэнтра культуры ў Гарадку Юрым АСТАПЧУКОМ.

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

— Якія галоўныя мерапрыемствы ладзіць Ваш цэнтр у гадавым маштабе?

— Мы арганізуем каля сарака мерапрыемстваў у год. Найперш скажу пра „Сяброўскую бяседу”, якую стараемся ладзіць у апошнюю суботу ліпеня ў Барыку. Сёлета выступіла на гэтай сцэне каля сарака выканаўцаў, у тым ліку пяць з Беларусі.

Чарговым нашым мерапрыемствам з’яўляецца „Свята Гарадка”, якое мы задумалі ладзіць у канцы або пачатку канікулярнага часу. Аднак сёлета атрымалася крыху інакш: была магчымасць атрымаць на гэта еўрасаюзныя сродкі, але толькі да канца чэрвеня; такім чынам гэтае свята сёлета адбылося 2 чэрвеня. Атрымалася яно вельмі ўдала — прыехалі да нас калектывы з суседняй Вялікай Бераставіцы са сваёй прапановай і мы тут адвялі два падворкі: для гасцей і для Гарадка. Імпрэза адбылася на вадасховішчы ў Зарэчанах і сабрала каля дзвюх тысяч гледачоў. Таксама на Зарэчанах адбыліся гмінныя дажынкі з прыблізна такой жа аўдыторыяй.

— А да „Басовішча” маеце дачыненне?

— Так — мы з’яўляемся суарганізатарамі гэтага мерапрыемства. Нашай задачай з’яўляецца нарыхтоўка месца для канцэртаў. Праводзім рамонт сцэны і адкрываем усе нашы рэсурсы для рэпетыцый і дэкарацый. Наш цэнтр забяспечвае „Басовішчу” таксама, напрыклад, ваду, электраток, пажарную ахову.

— А якія ў Вас яшчэ крыху меншыя мерапрыемствы?

— Стараемся падцягнуцца пад тыя дні, якія ў календары пазначаны святочнымі колерамі. Гэта розныя юбілеі, Дзень маці, Дзень жанчын, Дзень сеніёра, Дзень інваліда, Валянцінкі, дзяржаўныя святы. Стараемся на іх запрашаць калектывы так з Польшчы, як і з замежжа. Бывалі, напрыклад, у нас госці з Грэцыі ды Іспаніі.

— Цяпер можа скажаце пра Вашы калектывы, напрыклад, „Прымакі”.

— „Прымакі” працуюць не пад крыламі гарадоцкага Гміннага цэнтра культуры. Гэта прыватны калектыў камерцыйнага характару. Толькі я тут і там.

— Усё ж такі ў нашым грамадстве цікавасць да „Прымакоў” вялікая і хацелася б, у першую чаргу ад Вас, нешта і пра гэты калектыў пачуць. Як часта выступаеце?

— У сезон бывае, што ўсе дні тыдня заняты, аднак найчасцей канцэртуем з пятніцы да нядзелі ды ў іншыя святочныя дні.

— Будучы ў Новым Двары даведаўся я, што „Прымакі” даюць спецыяльны канцэрт у Сынкоўцах...

— Наш спонсар Ян Марчык выводзіцца з гэтай вёскі і вось для яго ў дзень ягонага свята — на Яна — ладзім у Сынкоўцах спецыяльны канцэрт у падзяцы за ягоную нам дапамогу. А ён стараецца наладзіць тое свята, каб прынесці такі падарунак сваёй вёсцы. Збіраецца тады шмат народу, многа прыязджае з навакольных вёсак, заўсёды бывае навадворскі войт, якога віншуем са сцэны. Там заўсёды цудоўная атмасфера. Ян Марчык арганізуе сваіх знаёмых і яны рыхтуюць адмысловую сцэну спецыяльна для нашага выступлення і нават засцілаюць яе дыванамі. Гэта вельмі ўзрушае. Пасля атрымліваем сотні эсэмэсак і мэйлаў з падзякамі, што далі такі канцэрт.

— Ці „Прымакі” бываюць у замежных гастролях?

— За граніцу ездзім часта. Сёлета былі прапановы з Літвы, Латвіі, Славакіі, Украіны, але ездзілі толькі ў Беларусь і Літву, бо іншыя прапановы атрымалі запозна, калі ўжо нашы тэрміны былі заняты.

— А дзе калектыў быў найдалей?

— Былі прапановы з Амерыкі, Грэцыі, Іспаніі, але немагчыма вырваць столькіх дзён з календара на далёкую паездку. Наш калектыў складаюць аматары, кожны чымсьці заняты: хто фірму сваю мае, хто вучыцца.

— Колькі асоб у калектыве?

— Зараз дзевяць, а яшчэ нядаўна было дзесяць — адышла мая сястра, якая стала матушкай і не выпадае ёй выступаць на эстрадзе.

— Колькі альбомаў выпусціў калектыў?

— Да гэтай пары два кампакт-дыскі, па 80 мінут музыкі на кожным, на першым 23 песні, на другім 20, без паўтарэнняў. І яшчэ прамацыйны кампакт-дыск Эвеліны Карчэўскай. Гэта свецкая музыка, а апрача гэтага маем яшчэ ў сваім дасье адзін кампакт-дыск з рэлігійнымі песнямі і адзін з калядкамі. Ды ранейшыя аўдыёкасеты: пяць са свецкай музыкай, дзве рэлігійныя і дзве з калядкамі.

— А якія калектывы дзейнічаюць пад крыламі Гміннага цэнтра культуры?

— У нас шмат людзей вельмі таленавітых, якія зараз згуртаваныя ў шаснаццаці калектывах. Такі размах магчымы дзякуючы спрыяльнай для культуры атмасферы ў гарадоцкім асяроддзі.

Найбольш вядомы „Расспяваны Гарадок” у якім зараз выступае 11 вакалістак пад мастацкім кіраўніцтвам Віктара Маланчыка; раней гэтую працу выконваў Сцяпан Копа. Калектыў даў шмат канцэртаў у Беларусі, а пра Польшчу складана сказаць, дзе ён не быў. За два гады „Расспяваны Гарадок” будзе адзначаць залаты юбілей — пяцідзесяцігоддзе.

Значна малодшы „Асенні ліст”, які працуе ўжо 11 гадоў; сёлета адзначым дзесяцігоддзе, бо раней не маглі, таму што ў калектыве выступаюць пенсіянеры, пажылыя людзі, якім здараецца жалоба, калі яны спыняюць выступленні. Атрымалі мы ўжо з Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі грошы на касцюмы, зараз афармляем іх выкананне ў Мінскай фабрыцы народных касцюмаў — вязу меры. І калі ўсё ўладзім, тады і адсвяткуем.

У нашым цэнтры працуюць тры маладзёжныя калектывы, якія гуртуюць надта таленавітую моладзь. Гэта „РІМА”, „5сот5 „і „Overday”.

У Залуках маем тры калектывы: „Каліна”, „Калінка” і „Каліначка” і ёсць яшчэ ў гэтай цудоўнай вёсцы закладка пад чацвёрты калектыў!

Апрача музычных гуртоў у нашым цэнтры працуе літаратурная група „Каласы”, якая гуртуе 11 творцаў. Яны прымаюць удзел ува ўсіх нашых мерапрыемствах. Група арганізуе конкурс за кубак войта Гарадоцкай гміны пад лозунгам „Кожны можа пісаць”. Гэта настолькі масавае мерапрыемства, што адбываюцца адборы, калі ацэнку творам даюць і аўтарытэтныя творцы, і настаўнікі мясцовых школ. Фінал сёлетняга выпуску — у лістападзе.

Дзейнічаюць у нас таксама дзве тэатральныя групы, якія рыхтуюць пастаноўкі пад важнейшыя мерапрыемствы.

Апрача згаданых груп займаюцца ў нашым цэнтры і шахматысты, і аматары галаваломак — на іхным уліку таксама поспехі. Маем трэнажорныя прылады, дзе займаецца спартыўная група. І стараемся, каб кожная з гэтых груп мела свой дзень, найчасцей у зімовыя канікулы, калі б магла паказаць свае дасягненні, сваё майстэрства.

— У якіх аб’ектах працуе Ваш цэнтр?

— Гэта будынак Гміннага цэнтра культуры ў Гарадку, а таксама вясковыя святліцы ў Валілах-Станцыі, Залуках, Случанцы і Меляшках.

— Ці ў Вас працуюць колы зацікаўленняў?

— Вядзем навуку ігры на музычных інструментах: гітара, клавішы, акардэон, флейта, бубен; у кожны дзень тыдня адбываюцца заняткі. Пластычныя заняткі з дзвюма групамі дзяцей вядзе ў нас выдатная інструктарка Марыя Мялешка; яна рыхтуе і дэкарацыі пад нашы мерапрыемствы. Я ахвотна пасылаю яе на ўсе курсы — ці гэта мастацкай апрацоўкі палатна, ці шкла, працы з гіпсам, воскам...

І яшчэ ў нас завёўся такі звычай, што пасля рэпетыцый на сцэне нашы мастакі адводзяць недзе па гадзіне часу для зацікаўленых, каб і іх прыцягнуць да мастацтва.

— Напэўна супрацоўнічаеце са школай...

— Наш комплекс школ таксама мае свае калектывы. Калі вось ладзім нейкі канцэрт, у мяне ўзнікае праблема, як гэтых усіх выканаўцаў змясціць у праграме; бывае, што адводзім ім толькі па пяць мінут. працяг ☞8

Усходняя мяжа

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Што зрабіць, каб усходняя мяжа Еўрасаюза, значыць, і Польшчы, была прыязнай, але і бяспечнай пасля ўваходу новых членаў ЕС у Шэнгенскую зону — абмяркоўвалі ўдзельнікі Грамадзянскага форуму „Еўрасаюз адкрыты і бяспечны", сарганізаванага ў Беластоку Інфармацыйным бюро Еўрапарламента і Інстытутам публічных спраў. Выступленняў палітыкаў і навукоўцаў, якія займаюцца аналізам паслядоўнасцей уваходу ў Шэнгенскую зону, а таксама прадстаўнікоў мундзірных службаў слухалі галоўным чынам студэнты Вышэйшай школы публічнай адміністрацыі, дзе праводзілася дэбата. Ніхто не сумняваўся, што найважнейшым вынікам пашырэння зоны ад новага года, а на практыцы ўжо ад 22 снежня (адмяненне адпраў у аэрапортах мае наступіць ад сакавіка 2008 г.) будзе свабоднае перасяканне ўнутраных еўрасаюзных межаў грамадзянамі членскіх краін. Аднак усё ставіцца пытанне аб уездзе асоб з-па-за ЕС, перш за ўсё з краін, якія суседнічаюць з усходняй Польшчай: з Беларусі, Украіны і Расіі.

— Застаецца дылема, як далучэнне да Шэнгенскай зоны будзе мець уплыў на міграцыйную палітыку і кантакты з суседзямі? Што рабіць, каб тыя кантакты былі лягчэйшыя, каб усходняя вонкавая мяжа ЕС была прыязная і ўзмацняла ролю Польшчы? — ставіла пытанні праф. Барбара Кудрыцкая, дэпутатка Еўрапарламента (ГП). — Ёсць пытанне, ці гэтыя дзверы будуць адкрытыя, ці толькі прыадчыненыя.

Некаторыя з дыскутантаў за недахоп пытанняў, якія паставіла праф. Кудрыцкая, папракалі польскіх палітыкаў, якія кіравалі краінай за апошнія гады.

Праф. Генавефа Грабоўская, еўрадэпутатка (СДПЛ):

— Польшча прайграла, бо не ўмела звярнуць увагі на зацікаўленне Еўрасаюза ўсходняй палітыкай або размовы наконт яе адбываліся над нашымі галовамі. Пазіцыя Польшчы ў ЕС — слабая.

Тут праф. Кудрыцкая ўключылася:

— Польшча мае вялікі ўплыў на еўрапейскую ўсходнюю палітыку, на тое, што датычыць Беларусі ці Украіны. Польскі ўрад мусіць падпісаць як найхутчэй двухбаковыя пагадненні з усходнімі суседзямі аб малым памежным руху (да 60 км у глыб краіны суседа — рэд.).

Праф. Грабоўская спаслалася тут на вызначэнні, да якіх дайшлі еўрасаюзная камісар па знешняй палітыцы Беніта Ферэра-Вальднэр і прадстаўнік МЗС Расіі па пытаннях развіцця стасункаў з ЕС Сяргэй Ястржэмбскі аб размовах Літвы і Польшчы з Расіяй наконт палёгкаў у памежным руху паміж тымі краінамі а Калінінградскай вобласцю. На гэтую мэту мае быць назначана 132 мільёны еўра. У размове з „Нівай" еўрадэпутатка Грабоўская адзначыла:

— Я не ведаю афіцыйнага камюніке, якое інфармавала б палякаў аб размовах паміж Польшчай і Беларуссю ў справе Шэнген. Можа быць, такія перамовы вядуцца ў зацішку кабінетаў, а, можа, не вядуцца так інтэнсіўна, як павінны. Польшчы ў гэтую хвіліну цяжка размаўляць з уладамі Беларусі, якія выконваюць досыць часта ў адносінах да палякаў, што прадстаўляюць нават Еўрасаюз, мала прыязныя дзеянні. Пакуль не будзе ачышчана перадполле, цяжка будзе гаварыць аб генеральных рэгуліроўках.

Прытым дадала:

— Я, аднак, вельмі незадаволеная, што павышана стаўка на візы для беларусаў да найвышэйшага ўзроўню. 60 еўра гэта вельмі вялікія грошы. Я лічу гэта непаразуменнем.

eyppoland.blox.pl

Праф. Барбара Кудрыцкая

Мусім тут пачаць такія дзеянні, каб даць магчымасць грамадзянам Беларусі пабываць у Польшчы, у гэтай частцы ЕС, якая дасць ім магчымасць пазнаёміцца з іншай аптацыяй функцыянавання краіны, дэмакратыі, захоўвання правоў чалавека.

Наконт магчымасці стварэння

d.wiadomosci24.pl

Праф. Генавефа Грабоўская

польска-беларускай зоны, у якой маглі б абавязваць палёгкі ў перасяканні мяжы, асабліва для сем'яў пражываючых па абодвух баках мяжы, прафесар Грабоўская заявіла:

— Гэта асноўныя правы чалавека. Бясспрэчна, што сем'і мусяць сустракацца. Генеральна, аднак, польскі ўрад мае звязаныя рукі, паколькі мусіць увесці прынцыпы наконт бяспекі еўрасаюзнай мяжы.

Сярод бяручых голас у час дыскусіі быў дэпутат Яўген Чыквін:

— Ад волі польскага ўрада залежыць, якія будуць прынцыпы ў памежным руху і для новага ўрада будзе гэта выпрабаванне. Не можа быць падатлівасці ў адносінах да Лукашэнкі, але нельга пры гэтай нагодзе караць людзей такіх, як мая мама.

У сваю чаргу былы консул РП у Гродне Анджэй Крэнтоўскі адзначыў:

— З Беларуссю мы на этапе кансультацыі далей, чым Літва.

Разважалася таксама праблема доўгатэрміновай занятасці асоб трапляючых у ЕС з-па-за яго тэрыторыі.

Консул Крэнтоўскі:

— Мы спазніліся са справай вырашання аб рабочых візах; расійскі рынак таксама патрабуе работнікаў. Толькі ў мінулым годзе на працу ў Расію выехалі два мільёны ўкраінцаў.

Прадстаўнікі мундзірных службаў у сваю чаргу адзначылі, што іх падраздзяленні добра падрыхтаваны да ўваходу Польшчы ў Шэнгенскую зону. Палкоўнік Мар'ян Пагода, камендант Падляшскай часці Памежнай стражы:

— Мы мусім гарантаваць бяспеку на мяжы, ды пры зялёным святле для тых, што хочуць яе перасякаць з добрымі намерамі. Цешыць гэта, што незалежна ад палітычных разхадаў, нашы службы не адварочваюцца ад сябе. Маем штодзённы кантакт.

Міраслаў Сянкевіч, дырэктар Мытнай палаты ў Беластоку:

— На рэгіянальным узроўні нашы стасункі з Беларуссю ладзяцца добра. У іншым выпадку не быў бы праязны гэты адрэзак мяжы. Наша параза, аднак, у тым, што з Мытнай палаты адыходзяць добрыя спецыялісты, у мінулым годзе сто з іх, а сёлета амаль сотня.

Другі бок мусіць паспяваць з разбудовай інфраструктуры.

Раман Папоў, ваяводскі камендант паліцыі ў Беластоку:

— Паліцыя з беларусамі не супрацоўнічае на найвышэйшых узроўнях, але ж для злачынцаў няма мяжы. Такія праблемы вырашаем шляхам індывідуальных кантактаў.

Караль Рэчкім, эксперт Еўрапейскага цэнтра Натолін спаслаўся на лозунг дэбаты:

— У лозунг „Еўрасаюз адкрыты і бяспечны" ўпісаны натуральны канфлікт. Неабавязкова гэтыя ўявы мусяць выключацца. Чым больш будзе Еўрасаюз бяспечным, тым больш будзе магчы быць адкрытым.

Пагрозы мяняюцца. Напрыклад, неабходна манітараваць пытанні аховы здароўя па-за ЕС, такія, як захворванні СНІДам у Калінінградскай вобласці.

У кіраўніка Інстытута публічных спраў праф. Лены Калярскай-Бабінскай мы спыталіся аб тым, ці не запозна ўжо на арганізацыю дэбат на тэму пашырэння Шэнгенскай зоны:

— Вядома, інфармаваць аб такіх справах трэба намнога раней. Запозна, мабыць, у тым, што мы павінны раней будаваць пачуццё прыналежнасці і гонару ад поўнага ўдзельніцтва ў ЕС, але і ўсведамляць аб тым, якія цяжкасці нас сустрэнуць у кантактах з усходнімі суседзямі. Мне здаецца, што пасля ўваходу Польшчы ў ЕС зусім заняпала інфармацыйная палітыка наконт нашага членства ў Еўрасаюзе.

І дадала:

— Можа, запозна ў такім сэнсе, што няма рэгуліровак наконт жыццёвых пытанняў людзей па абодвух баках мяжы і размовы на гэтую тэму павінны весціся ўвесь час, хоць у польска-беларускім выпадку не ведаю на якім узроўні, можа, не найвышэйшым, бо гэта ўжо палітычныя пытанні. Справа ў тым, каб не стварыць такога муру, як паміж Палесцінай і Ізраілем.

Святая праўда

З зацікаўленнем прачытаў я публікацыю Віктара Буры „Абыякавыя войты" („Ніва" № 43 ад 28 кастрычніка), у якой аўтар паказвае як кіраўнікі мясцовага самаўраду ставяцца да справы ажыццяўлення закону аб нацыянальных меншасцях і рэгіянальнай мове. Віктар Бура, пішучы пра абыякавасць гмінных чыноўнікаў да гэтай справы, пакарыстаўся прыкладам арлянскага войта. Але і ў Чаромсе справа не лепш маецца. Не гавару тут аб увядзенні двухмоўнай назвы мясцовасці, але хопіць глянуць хоць бы на арганізаванне беларускіх мерапрыемстваў. Мясцовы ГОК штогод арганізуе імпрэзу пад шыльдай Саюза ўкраінцаў Падляшша, а па беларускіх мерапрыемствах (ад моманту спынення арганізавання Галоўным праўленнем БГКТ народных фэстаў) след прастыў. Праўда, у рамках фолькавых сустрэч „З вясковага панадворка" прэзентуюцца беларускія гурты, але гэта капля вады ў моры, паколькі іхні рэпертуар абмяжоўваецца ўсяго да некалькіх твораў, замест шматгадзіннага канцэрта. Варта прыгадаць, што апекуны чаромхаўскай культуры (дырэктар ГОКа, войт са старшынёю Рады гміны разам з большасцю радных) лічацца „тутэйшымі", хоць мала калі пачуем у іх размову на мясцовай гаворцы. Гмінная бібліятэка не робіць падпіскі на беларускія часопісы. Як гаварыла мне загадчыца бібліятэкі, на гэтую мэту не хапае грошай. Аднак войт не скупіць іх на „Wieści Podlaskie", якія свабодна можна атрымаць у гміннай управе. Праўду піша Віктар Бура, што войты ды бурмістры пра свае карані прыпамінаюць у час выбарчай кампаніі, калі патрэбна падтрымка народа. На вясковым сходзе ў Кузаве, напрыклад, у час апошніх выбараў войт Врублеўскі размаўляў з жыхарамі салэцтва на мясцовым дыялекце. І гэта нядрэнна атрымалася. Шкада, што такія сходы бываюць раз на нейкі час, бо штодзень наведвальнікі вымушны з войтам размаўляць на польскай мове. Не стану спасылацца на іншыя прыклады, бо была б гэта агульнавядомая вада на млын. Падтрымоўваю затым заклік Віктара Буры: «Пакіньце наступным пакаленням добрую памяць па сабе, спадары войты, бо як добра ведаеце, пасада чыноўніка не пажыццёвая».

Уладзімір СІДАРУК

Бяроза на павароце

Летам моцны вецер вывярнуў старую бярозу на другім павароце рухлівай асфальтавай шашы з Новага Ляўкова ў Плянту ў Нараўчанскай гміне. Высокая ды цяжкая бяроза моцна павісла на суседнім дрэве, верхавінай.

На адной з летніх сесій нараўчанскай Рады гміны пра пагрозу, якую стварае вывернутая віхрам бяроза на павароце дарогі, гаварыў новаабраны солтыс вёскі Плянта. Войт запісаў гэты факт, каб паведаміць Падляшскае праўленне ваяводскіх дарог у Беластоку.

Ехаў я гэтай дарогай 1 лістапада г.г. і ўбачыў: тая бяроза ў прыдарожным рове ледзь-ледзь трымаецца вяршком за другое дрэва. Яна можа ўпасці ў любы момант, калі мацней павее вецер, на маставую ды на праязджаючыя аўтамашыны. Чым гэта можа скончыцца? Ці дарожныя службы не бачаць што ствараецца небяспека ў дарожным руху? **(ян)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Падарунак настаўнікам

12 кастрычніка ў школе ў Нарве адзначалі Дзень настаўніка. Гімназісты з трэцяга „а" класа падрыхтавалі п'есу пад загалоўкам „Адкуль узяўся настаўнік на свеце". Спектакль адбыўся ў малой зале. Тэмай п'есы была цяжкая праца настаўніка і яго старанні навучыць дзяцей як найлепш. Перад публікай выступілі: Эвеліна Іванюк (у ролі настаўніка), Эвеліна Прабуцкая (Адам), Анна Порац (Ева), Хрыстафор Кур'яновіч (Люцыпар), Мар'янна Садоўская (працаўнік гміны), Анна Пашко і Эвеліна Кананюк (анёлы), Анна Тэслюк, Іаанна Самойлюк, Моніка Жакевіч (чэрці), Іаанна Жакевіч, Эвеліна Келбашэўская, Данель Сельвяструк, Уля Рашкоўская (дзеці), Іаанна Купай (Бог).

Мар'янна Садоўская (першая злева) ў школьнай пастаноўцы

П'еса каларытна высветліла адкуль у нашай школе з'явіўся настаўнік. Усе настаўнікі, якія прыйшлі паглядзець наш спектакль, атрымалі каляровыя філіжанкі. Гэта быў вельмі важны для нас усіх дзень. Нам, вучням, вельмі прыемна было пачуць смех і пабачыць задавальненне на тварах настаўнікаў. П'есу мы падрыхтавалі пад кірункам спадарыні Вольгі Гевы, а песень навучыла нас спадарыня Ева Алімоўская. Дзякуем ім за дапамогу і працу.

Мар'янна САДОЎСКАЯ
і Дамініка ЮШКЕВІЧ
Гімназія ў Нарве

Кніжка пра дарастанне

— Год таму мы дамовіліся з рэдактаркай „Зоркі" каб пісаць і маляваць гісторыі з жыцця сучасных гімназістаў, — піша natasza9922@wp.pl. — У цыкле „Муха ціп-топ" мы з lolcia05@tlen.pl стараліся адлюстраваць у літаратурнай і карцінкавай версіі навучальны 2006/2007 год. Нашы праблемы з настаўнікамі і бацькамі, нашы клопаты і захапленні, першыя каханні і расчараванні...

„Муха ціп-топ"* чытаецца з прыемнасцю і цікавасцю. Кніжка вабіць жывымі і смешнымі малюнкамі і своеасаблівай атмасферай. Галоўны герой Міколка — спачатку зацяты прагульшчык, жулік і прадстаўнік субкультуры „дрэсаў", пад уплывам кахання перажывае метамарфозу. Хлапец становіцца ідэалам і царкоўным прыслужнікам. Змена вельмі не падабаецца яго класным сяброўкам. Дзяўчаты лічаць, што „новы" Міколка — нудны. І робяць усё, каб ён парваў з Марысяй. У канцы дзяўчына сама яго кіне. Але няма тут трагедыі. Міколка адразу знаходзіць другую сімпатыю, у гэты раз з-пад знака субкультуры „эмо". І пачынае ездзіць на скейце. Няма, аднак, павароту да першапачатковай безнадзейнасці. Ужо ў першы дзень новага іміджу Міколка б'ецца са „скінамі". Усе інтрыгі ў пэўнай ступені гэта вынік правакацыі з боку чатырох шалёных дзяўчатак: Басі Мухі, Ганны Геніюш, Соні Квяткоўскай і Касі Міцкевіч. Яны таксама, невядома ў які момант, мяняюцца, дарастаюць.

Літаратурныя постаці вельмі каларытныя і „сапраўдныя", мабыць, таму самі аўтаркі баяцца рэакцыі чытачоў.

Кніжку аддаем у вашы рукі з пэўным страхам. Напэўна многія з вас знойдуць у ёй герояў падобных на сябе ды пакрыўдзяцца на нас.

Аўтаркі напамінаюць, што ўсе літаратурныя постаці гэта выдумка, а тым хто не мае пачуцця гумару, раяць:

— Хай яны лепш палічаць сябе больш важнымі, бо пішам пра іх у кніжцы.

Кніжку можна набыць у рэдакцыі „Нівы". А нашы пастаянныя чытачы (падпісчыкі) атрымаюць яе ў падарунку. Гэта падарунак з нагоды залатога юбілею „Зоркі", які адзначаем на працягу 2007 года.

ЗОРКА
natasza9922@wp.pl
lolcia05@tlen.pl,
***Муха ціп-топ*, Беласток 2007.**

ПІСТОРЫЯ ПРА ТОЕ, ЯК ТРЭБА ВЫБІРАЦЬ ВІНО Ў РЭСТАРАЦЫІ

Міхась вельмі хацеў запрасіць Гражынку ў рэстарацыю. Так хацеў, што аднойчы ён проста набраў ейны нумар і проста сказаў:

— Я цябе запрашаю. Сёння. У рэстарацыю.

І яна — пагадзілася.

А вечарам, калі яны сядзелі ў самым утульным куточку беластоцкіх шыкоўных месцейкаў, першае, што гэтак салідна прамовіў Міхась, было:

— Што будзем піць?

— Што будзем піць? — паўтарыла Гражынка. — А што можна?

— Сёння ўсё можна, — адказаў юнак і, не падаючы аніякага выгляду, спахапіўся сам адчаёва: грошай у яго бракавала. Так бракавала, што хапіла б толькі на самае таннае віно ды яшчэ ў самай маленькай шкляначцы.

Аднак спакойна раскрыў меню, спакойна знайшоў старонку з назовамі розных напояў.

— Выбірай любое, — сказаў, намацваючы ў кішэні ўсе свае ашчадныя скарбы.

— Любое? Нават самае дарагое? — усміхнулася ўсцешаная, задаволеная дзяўчынка.

— Нават самае дарагое, — не міргнуўшы, адказаў Міхась.

— Можна? — Гражына ўзяла меню, уважліва пачала ўглядацца ў назовы. І раптам рэзка закрыла, зноў усцешана ўсміхнулася: — Выбрала!

Калі наблізіўся афіцыянт, калі Міхась ужо не ведаў, праз якое акно ўцякаць з рэстарацыі, Гражынка ўрэшце зрабіла заказ.

— Будзьце так ласкавы, зрабіце... Прынясіце, калі ласка... Дзве шклянкі соку. Апельсінавы і вінаградны.

— А... чаму вінаградны?! — толькі і здолеў выдыхнуць раптоўна ўзмакрэлы Міхась.

— Таму, што я ведаю, што ты вельмі яго хацеў.

— Так, хацеў, — усміхнуўся гэтак жа ўсцешана і сам кавалер.

І быў у іх вечар. Была рэстарацыя. Была лёгкая вячэра і дзве шклянкі соку. І на ўсё, на ўсё хапіла ў іх грошай. А на што не хапіла...

Тое заўсёды можа быць нечым заменена. І зусім неабавязкова апельсінавым сокам.

Ваш Дзядзечка Сід
26 кастрычніка 2007 г., Кобрын

Янка ЖУРБА

Мядзведзь

Прыйшла з вятрамі восень,
Шуміць высокі лес.
Пайшоў мядзведзь па лесе,
Далёка ў глуш залез.
Пад елкай вырыў яму,
Паслаў у ёй галлё, —
І ўжо гатова ў Мішкі
Зімовае жыллё.
А каб мароз траскучы
Не ўлез к яму зімой,
Наклаў галля над новай
Бярлогаю сваёй.
Вось Мішка ўжо ў бярлозе,
Утульна тут яму.
Паправіў ён галінкі,
Залёг на ўсю зіму.
Прыйшла зіма з марозам,
Заснуў і лес, і бор.
Завеі заспявалі
На ўвесь лясны прастор.
А Мішка і не дбае.
Яго спакойны сон.
Ён спіць на мяккім вецці
Аж да вясенніх дзён.

ТУТЭЙШЫЯ ЗАМАЛЁЎКІ

Шурамура

Шурыка ведаю трынаццаць гадоў. Не памятаю ўжо як мы пазнаёміліся, але памятаю як у час першай сустрэчы ён называў сябе амерыканцам — бо нарадзіўся ў ЗША. Шурык — заядлы камп'ютэршчык. Ён шпацыруе са сваім ноўтбукам па горадзе як з сабакам і заўсёды даступны па асьцы. Да таго цэлымі днямі глядзіць японскія фільмы жанру аніме.

У мінулым годзе Шурык узняў бунт у нашым класе. Разам са сваім сябрам Сэбам рысавалі шаржы настаўнікаў. Мы таксама пачалі сварыцца з усімі настаўнікамі... Бунт вельмі прыкра для нас скончыўся. Наша выхавацелька перастала з намі цацкацца ды ўляпіла шмат дрэнных ацэнак за паводзіны на канец школьнага года. Іншыя настаўнікі і дырэктарка таксама перасталі нас любіць.

Шурык слухае панк-рок і метал. Ён ходзіць у чорнай вопратцы і старых чаравіках-*глянах*. На галаве тырчыць яму чуб-іракез. Цяжка паверыць, што яшчэ тры гады таму ён быў паклоннікам поп-музыкі, а яго любімай зоркай быў Энрыке Іглесіяс.

Шурык чамусьці не любіць нашага сябры скейта. Калі бачыць яго са мной або Лёляй, заўсёды яго крытыкуе. Пад канец мінула года хлопцы падзерліся. Прычынай бойкі сталі разыходжанні ў музычных густах. Шурык даказваў, што найважнейшы метал, а скейт бараніў панк-рока. Яны патаўкліся да крыві, а на іх бойку глядзела палова гімназіі. Мы з Лёляй былі вінаватыя.

— Я нічога не разумею, — дзівавалася Лёля. — Шурык паводзіць сябе так, быццам быў зайздросны за скейта, а сам не хоча з намі сябраваць?!

— Людзі называюць такога „сабакам агародніка" (сам не гам і камусь не дам!), — пагадзілася я.

Пасля мы дайшлі да вываду, што хлапец уцякае ад нас у краіну камп'ютэраў не толькі ў віртуальным сэнсе. Да нас дайшлі чуткі, што ён стаў вывучаць японскую мову. Мы падазраём, што Шурык *паплыў* у бок Ціхага акіяна... бо закахаўся ў сапраўдную японку.

truskawka9922@tlen.pl
lolcia05@tlen.pl

Музыка з кайфам

Духавая „Сцяна"

Маладосць ды энергетыка — гэта два словы, якія дакладна акрэсліваюць вядомы берасцейскі гурт. Хацелася б сказаць, што яшчэ вельмі малады, але калі так вярнуцца памяццю, то ўжо прайшло пару гадоў з моманту, калі мы супольна святкавалі пяцігадовы юбілей заснаванага маладымі музыкамі гурту „Сцяна", пра які ў пару словах пастараюся вам расказаць. А ёсць і пра што, бо гэты гурт, правінцыяльны ў кантэксце Мінска, пра што я вам казала ўжо пры аповесці пра гурт „Б.Н.", многа чаго дасягнуў за інтэнсіўны час свайго існавання. Добра помню дэбютныя моманты кампаніі з Бярэсця на польскіх сцэнах , вядома, гэта ж не магло быць у іншым месцы чым нашая лясная сцэна ў Гарадку, ва ўрочышчы Барык. Фестываль „Басовішча" шмат чаго добрага зрабіў для прамоцыі беларускіх маладых гуртоў, а „Сцяна" ўмела гэтым пакарыстацца. Шчасліва для нас, побач цяжкіх гітарных гукаў чуваць таксама духавы інструмент, а дакладна саксафон, што абсалютна адрозніваe іх ад іншых. Але іх адметнасць двухбаковая, не толькі інакш гучаць дзякуючы працы саксафаніста, але таксама гітарныя мелодыі кранаюць асабліва слухача, гэта творчы непакой, які вось у гэтым выпадку рок-гурту чуваць з першых гукаў песні. Варта таксама слухаць тэксты „Сцяны", яны прадуманы, а заадно не гавораць так непасрэдна пра справы, а энсаў часам трэба проста даўжэй пашукаць.

Часта вакал Пашкі параўноўваюць да Лявона Вольскага, бо ён спецыфічны, але я буду бараніць непаўторнасці абодвух спевакоў. Але, мабыць, штосьці ў гэтым ёсць, у больш пазітыўным сэнсе, бо вельмі прыемна слухаецца кавер „Сцяны" на песню „Н.Р.М." „Я еду".

Штодзень, можна сказаць, займаюцца яны мастацкай працай, працуюць на тэлебачанні, працуюць з гукамі, займаюцца таксама беларускай мовай, а Жэня, якая для гісторыі гурту вельмі важная, хаця цяпер з ім не працуе, займаецца акцёрствам. Самае галоўнае, што музыкі гурту — гэта проста добрыя людзі, заангажаваныя ў сваю працу, якія са шчырасцю і сімпатыяй ставяцца да людзей. Не забуду ніколі шпацыраў ноччу па Бярэсці, калі мы спявалі супольна пад гітару, а мы ж тады яшчэ так каротка ведалі адзін аднаго. Гэта проста людзі з кайфам.

А я напамінаю, што можаце мне пісаць, чакаю вашых пытанняў і адгалосак па мэйлавай дарозе!!!

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 45



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 41: Малпа, слова, комік, лок, абед, лязо, Лі, ар, шаг, факт. Скала, лоб, Гомер, від, мак, ла, Лі, Лёля, проза, корт.

Узнагароды, **запісныя кніжкі і каляровыя алоўкі,** выйгралі: **Карына Гіншт, Дарыя Анна Капытка, Магдаліна Місяюк, Юлія Нікалаюк, Данеля Філіманюк, Мажэна Дмітрук** з Чыжоў, **Габрыель Ярацэвіч, Магдаліна Сахарчук, Эвеліна Белаказовіч, Юлія Панютыч** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!

Больш такіх ластавак

З прыемнасцю прачытаў я рэпартаж Міры Лукшы „Лук'янюкова хата не з краю" („Ніва" № 44 ад 4 лістапада) пра Мікалая Лук'янюка і ягоны томік вершаў „З нарваўскага боку". З Мікалаем я пазнаёміўся на старонках „Нівы", затым сустракаліся мы на з'ездах карэспандэнтаў, ды па сённяшні дзень яднае нас сяброўства. Варта адзначыць, што Лук'янюк выйшаў з ніўскага кола карэспандэнтаў. З таго ж асяроддзя выводзяцца Васіль Петручук, Міхась Куптэль, якія прэзентаваліся раней пры нагодзе выхаду іхніх кніжак. Супрацоўніцтва з „Нівай", значыцца, дае карэспандэнту не толькі задавальненне з публікаваных допісаў, але і магчымасць стаць у пазнейшым аўтарам кніжных выданняў. Хто будзе наследнікам вышэйзгаданых аўтараў і запрэзентуе чытачам вынік сваёй шматгадовай публіцыстычнай працы ў выглядзе кніжкі, цяжка сказаць. Прызнаюся шчыра, што і ў мяне ёсць такая ідэя. Можна было б разлічваць і на Грышу Мароза ці Пятра Байко, але яны чамусьці апошнім часам рэдка гасцююць на старонках нашага тыднёвіка. А шкада, бо іхнія публікацыі былі надта цікавымі.

Грышу Мароза бачыў я ў Беластоку на юбілеі пяцідзесяцігоддзя „Нівы". Пасля гэтай сустрэчы друкавалася некалькі ягоных допісаў. Але ён зноў сціх. А Пётр Байко чамусьці маўчыць. Няўжо няма тэм для допісаў? Разгляньцеся, паважаныя калегі, па наваколлі. Тэмаў хоць адбаўляй. Паспрабуйце пакарыстацца прыкладам Жэні Мартынюк з Бельска-Падляшскага. Даўней, калі яна жыла ў Зубаве, часта пасылала допісы з наваколля. Пазней перасялілася ў горад. Быў перапынак. Зараз зноў пасылае свае замалёўкі з гарадскога жыцця, прычым не забывае родную вёску. Прыемная гэта вестка і хацелся б, каб такіх ластавак усё больш прылятала ў рэдакцыю.

Віншую Мікалая Лук'янюка з выхадам паэтычнага зборніка і жадаю яму далейшых поспехаў на ніве роднага слова.

Уладзімір СІДАРУК

Ляўкова
Тут жыве традыцыя

Зараз маем доўгія асеннія вечары. Вясковыя жанчыны больш часу праводзяць дома (якраз пара шаткавання капусты). Цяпер і вяселле за вяселлем ладзяць.

Святлічанка Галена Рэент запрашае жанчын на супольныя вечарыны ў клуб у Старым Ляўкове (Нараўчанская гміна). Тут нядаўна адсвяткавалі Дзень сеніёра. Сюды прыходзяць займацца аэробікай.

24 кастрычніка жанчыны пяклі каравай пад кірункам самых вопытных каравайніц Веры Осяк і Вольгі Адамюк. Панавала прыемная атмасфера — адчувалася быццам напярэдадні сапраўднага вяселля. Васемнаццаць жанчын з Ляўкова і навакольных вёсак спявала абрадавыя песні, мясіла цеста, рабіла ўпрыгожанні да каравая, між іншым, гусачкі і буслінныя лапкі. І трэба адзначыць, што каравай быў адмысловы. Усе яго спрабавалі і хвалілі. Вечарына працягвалася больш за тры гадзіны. А колькі прыгожых песень праспявалі. Колькі было ўспамінаў пра колішнія вяселлі! Мерапрыемства здымаў Юрый Равінскі. Пячэннем каравая была зацікаўлена моладзь. Неўзабаве ў стараляўкоўскай святліцы зноў адбудзецца цікавая вечарына. Жанчыны будуць пяклі бульбяную бабку.

(ЯН)

Арлянскі музыка

Міхал МІНЦЭВІЧ

Мікалая Лопуха сустрэў я на беларускім фэсце 2 верасня г.г., а зацікавіў ён мяне не толькі сваім капелюшом. Яшчэ нядаўна немагчыма было ўявіць яго адсутнасці на любым фэсце ці конкурсе беларускай песні. Звыш сарака гадоў ён бесперапынна спяваў (а раней таксама акампаніраваў на мандаліне і акустычнай гітары) у арлянскім фальклорным калектыве. Спыніць мастацкую актыўнасць прымусіла яго хвароба і смерць жонкі Марыі, якая таксама выступала з „Арлянамі". Абое яны, Марыя і Мікалай, раней працавалі на мясцовай пошце лістаношамі.

У жыцці так здараецца, што з важных прычын людзі спыняюць сваю мастацкую актыўнасць, нават на доўгі час, але пасля здараецца ім вярнуцца на сцэну. Спадар Мікалай паспяхова выступаў у калектыве, таму я і спытаў яго пра магчымыя ягоныя музычныя планы.

— На сцэну я, бадай, ужо не выйду, бо і здароўе не тое; і з голасам так як і са здароўем. Аднак музыкай я цікаўлюся пастаянна, асабліва акардэонам. Я ўмею нядрэнна іграць і хачу яшчэ купіць двухрадкоўку. Разглядаюся за гэтым інструментам ужо ад некалькіх гадоў і не магу здабыць. Раней прывозілі іх на рынак з усходу, але цяпер не відаць. Музыкі, што імі карыстаюцца, не прапалі ж. Прасіў я людзей, што прыязджаюць з Беларусі гандляваць ці на працу, але чамусьці адмаўляюць. Кажуць што няма, што цяжка. Нядаўна пачуў я на рынку, што Лукашэнка ўстанавіў строгі парадак у лясах і нельга ўзяць адтуль нават ветачкі — усё забірае дзяржава і прадае на апал. Але гармоніка пашукаю я далей.

Спадар Мікалай выдатна спалучаў сваю прафесійную працу з грамадскай дзейнасцю ў карысць беларускай культуры.

— Больш сарака гадоў выступаў я ў мясцовым калектыве з моманту яго заснавання Радзівонам Адзіевічам. Тады, у пасляваенны час, давалі мы многа канцэртаў па ўсёй краіне: у Варшаве, Шчэціне, Любліне, Ломжы... Усе члены калектыву — звыш дзесяці чалавек — іграліі на струнных інструментах; я — на балалайцы. Усюды прымалі нас сардэчна, таму і хацелася ездзіць. Да калектыву далучаліся новыя людзі, а я ўвесь час увасабляў яго традыцыю (зараз, пасля доўгага перапынку, у калектыў вярнуўся іншы мастак — Фёдар Адзіевіч з Орлі). У „Арлянах" выступаў я з хорам, у дуэце і заўсёды з сольнымі тэнаровымі партыямі.

У 1988 годзе — разам з іншымі вакалістамі з замежжа: Бельгіі, Галандыі, Аўстрыі — пабываў я ў Мінску дзеля дасканалення нашых кваліфікацый. З Польшчы было нас трое: жанчына з Чыжоў, Мікалай Бушко з Гайнаўкі і я — дадае спадар Лопух.

Заўважаю, што ў Орлі на працягу многіх гадоў гмінныя ўлады не бачылі патрэбы ўшанавання сваіх самадзейнікаў, а калі ўжо адзначылі юбілей 55-годдзя (пра гэту справу „Ніва" пісала ў лютым 1997 года), тады арганізатары мерапрыемства не запрасілі нікога з былых членаў калектыву, і то заслужаных. Гэта многіх угнявіла...

Фота Міхала МІНЦЭВІЧА

Мікалай Лопух у мексіканскім строі, які атрымаў ад знаёмага з замежжа

— Ну, што ж, можна было з таго зрабіць такі вывад: рабі, працуй, нават усё жыццё прысвяці беларускай культуры, а на канец і так павернуцца да цябе спіной, у вочы не глянуць.

А як успамінаеце працу пісьманосца? — пытаю. Сёлета ў арлянскай пошце зрабілі шыкоўны рамонт. Як калісь працавалі пісьманосцы?

— Ой, гэта была агромная праца, колькі мы тады напрацаваліся! І няспынна праверкі і праверкі.

На пасаду пісьманосца стаў я ў лютым 1956 года і працаваў там 35 гадоў да адыходу на пенсію ў 1991 годзе. У пасляваенны перыяд, недзе да 1953 года, пісьманосцы абслугоўвалі вельмі вялікія абшары. Адзін падавец арлянскага паштамта меў пад сабою пятнаццаць вёсак — аж пад Гайнаўку! Тады, аднак, лістаношы не разносілі карэспандэнцыі па хатах, толькі пакідалі салтысам, якія раздавалі яе адрасатам, а пісьманосец ехаў далей, у чарговую вёску. Пасля пазначана меншыя ўчасткі і тады ўжо пісьманосцы сталі самі дастаўляць пасылкі адрасатам. Кожны пісьманосец меў вызначаны свой участак. Я абслугоўваў палову Орлі, Крывятычы, Шчыты (абедзве вёскі і калоніі), Міклашы, Парцава, Спічкі і Вульку. Спачатку хадзіў я па вёсках пяшком, пасля калясіў веласіпедам, затым мапедам, а ў асабліва цяжкія зімы даводзілася дабірацца ў свае вёскі нават на лыжах.

У 1970-х гадах улады ўзвалілі на нас распаўсюджванне чытальніцтва, адукацыю сялян шляхам пастаўкі ім розных сельскагаспадарчых газет. І гміна ў той час слала людзям мноства карэспандэнцыі, а то наконт угнаенняў, а то пасяўнога матэрыялу. Слалі надта многа напамінаў — кіпы папер трэба было насіць... Не заплаціў гаспадар падатку — напамін, не раскідаў старога будынка — напамін, не знёс у пару страхі — напамін... Мноства спраў з гміннай управы перавальвалася праз пошту. Тады маркі танныя былі. А насіць паперы трэба было. Аднаму гаспадару, помню, насіў напаміны чатыры разы ў тыдзень!

На пісьманосцаў быў ускладзены абавязак выканання плана падпісак, за што атрымлівалі ўзнагароды. У 1960-х і 1970-х гадах я шматразова дабіваўся звання найлепшага падаўца ў Бельскім раёне. У 1973 годзе ў мяне было найбольш у ваяводстве падпісчыкаў „Gazety Białostockiej". Тройчы быў я ўдастоены адзнакі „Zasłużony Pracownik Łączności".

За дзень трэба было развезці 750 штук саміх газет, у тым ліку 300 штук „Gazety Białostockiej". Прэса і карэспандэнцыя не змяшчаліся ў паштовай сумцы і трэба было забіраць іх двойчы. Пісьманосец развозіў за дзень па 30-50 кілаграмаў пасылак. Вазіў таксама шмат грошай, бо прымаў падпіску, дастаўляў грошы за малако, развозіў пенсіі. Да 1980-х гадоў было нямнога пенсіянераў у вёсках, але пасля іх лік значна паболшаў. Таксама трэба было забіраць утаргоўкі з вясковых крамаў, прымаць узносы на ашчадныя кніжкі ПКО. Прадавалі мы таксама паштовыя маркі... У кожнай вёсцы была паштовая скрынка, з якой трэба было забіраць карэспандэнцыю...

А кантралявалі тады нас вельмі часта. Прыязджалі кантралёры і з раёна, і з ваяводства, і з галоўнай дырэкцыі. Правяралі ўсё: ці грошы ў парадку, ці перададзены пісьмы, ці газеты не ўчарашнія. Бывала, нехта прыходзіў са скаргай, што пісьманосец не заплаціў, напрыклад, за малако. Бо здараліся, вядома, памылкі, але здараліся таксама і ашуканцы. Заплаціш такому пенсію так як трэба, жонка схавае грошы ў буфет, а муж падбярэ іх і пойдзе на віно. І крык пасля, што пісьманосец не даплаціў. Але здаралася таксама, што пісьманосец пераплаціў.

Многа было работы, — успамінае з сантыментам сваю працу на пошце Мікалай Лопух. — А сёння пошта выглядае як звычайная крама — газеты прадаюць, парашкі якіясь і г.д. Таксама менш пісьмаў людзі пішуць.

4 ☞ працяг

— Грунт для мастацтва ў Гарадку вельмі ўраджайны, бо, мабыць, тут такія людзі, што дзякуючы ім усё само робіцца. Ці маглі б Вы назваць такіх чарадзеяў грамадскай актыўнасці?

— Тут людзі сапраўды вельмі таленавітыя, але я нікога не буду называць. Дастаткова падаць ім руку, дапамагчы, тады ўсё само па сабе развіваецца, усе працуюць з чыстай ахвотай.

— Ці маеце спонсараў?

— Гэта ў першую чаргу наш войт. Гэта вельмі добры чалавек, які ніколі не забыве пра культуру і з усіх сіл нам памагае. І ад мяне яму найвышэйшая падзяка. Апрача гміны пішам праекты ў еўрасаюзныя ўстановы, у МУСіА. Звяртаемся і да прадпрыемстваў і тыя, што маюць магчымасці, напрыклад, банкі ці фірмы, па меры магчымасцей нам памагаюць.

— Як выглядаюць Вашы кантакты з іншымі гмінамі?

— Трымаем кантакт з многімі дамамі культуры, не толькі ў Польшчы, але і ў замежжы. Дамаўляемся на цэлы аўтобус выканаўцаў. Супрацоўнічаем з усімі навакольнымі гмінамі.

— А з беларускім бокам?

— Часта да іх ездзім і яны прыязджаюць да нас, ладзім творчы абмен. Вось арганізуем сустрэчу нашых літаратараў з беларускімі. Гэтаму трансгранічнаму абмену спрыяе Еўрасаюз і мы гэтым карыстаемся. Цяжка ў Беларусі знайсці большую мясцовасць, у якой не пабываў бы нейкі калектыў з Гарадка.

— А з польскай „глыбінкай"?

— Таксама бываем, напрыклад, у Баранове на Курпях ці ў Драгічыне.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Уладзімір Казбярук: „Беларуская літаратура Беласточчыны — з'ява фенаменальная"

Сяргей ЧЫГРЫН

Беларускі крытык і літаратуразнавец Уладзімір Казбярук (нарадзіўся ў вёсцы Бандары на Беласточчыне) падрыхтаваў і нядаўна выдаў у Мінску кнігу „Выбраных твораў" Змітрака Бядулі, вершы і апавяданні якога даўно ў Беларусі не выдаваліся. У сувязі з выхадам гэтай кнігі, наш карэспандэнт задаў некалькі пытанняў спадару Казберуку. А таксама запытаўся ў яго пра асабістую творчасць і беларускую літаратуру.

— ***Уладзімір Міхайлавіч, чаму Вы вырашылі падрыхтаваць ладны том твораў Змітрака Бядулі?***

— „Выбраныя творы" Змітрака Бядулі з'явіліся ў папулярным мінскім выдавецтве „Кнігазбор". Калісьці я для гэтага выдавецтва падрыхтаваў Алеся Гаруна і прымаў удзел у падрыхтоўцы кнігі Аляксандра Ельскага. Між іншым, у 2000 годзе там выйшла кніга „Беларускія пісьменнікі Польшчы", складальнікам якой быў Ян Чыквін. Дарэчы, усе справы, звязаныя з публікацыяй кніг у „Кнігазборы", вырашае пісьменнік Кастусь Цвірка. Ён мне прапанаваў падрыхтаваць і выдаць Змітрака Бядулю. То я не мог не пагадзіцца, тым больш, што класік нашай літаратуры заслужыў, каб яго творы перавыдаваліся і чыталіся.

— ***Бягучы год — год юбілеяў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Вы шмат даследавалі творчасць Якуба Коласа да 1917 года, а таксама яго паэму „Новая зямля", адносіны Янкі Купалы з Максімам Горкім, пра Купалаўскія пераклады і іншыя матэрыялы. Што Вы скажаце сёння на гэты конт?***


Фота архіў „Нівы"

— У свой час адзначаць 100-годдзе з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі я ездзіў у Польшчу. У гэтым годзе ўжо не прымаю актыўнага ўдзелу ні ў якіх мерапрыемствах. Здароўе не дазваляе, ды і мне ўжо 84 гады. Але лічу, што Янка Купала і Якуб Колас ратавалі беларушчыну ад заняпаду, ад той смяротнай небяспекі, якая пагражала ёй з боку такіх дзеячаў як Кнорын (Кнорыньш) з кампаньёнамі. Пра творчасць народных паэтаў напісана шмат. Але сёння мы яшчэ, магчыма, недастаткова выразна паказалі тую ролю, якую яны і іх найбольш самаахвярныя сучаснікі (у тым ліку і дзеячы Беларускай Народнай Рэспублікі) адыгралі ў пераўтварэнні Паўночна-Заходняга краю ў Беларусь, якая ўжо надзейна займае „свой пачэсны пасад між народамі", пра неабходнасць чаго з такой надзеяй пісаў калісьці Янка Купала.

— ***Уладзімір Міхайлавіч, у 2003 годзе выйшаў асобным выданнем Ваш цікавы навукова-папулярны нарыс „Францішак Скарына". Скажыце, калі ласка, у чым загадкавасць нашага першадрукара?***

— У чым загадкавасць Скарыны? Скажу шчыра, што сёння нам трэба весці гаворку не пра нейкую загадкавасць беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара, а мы павінны больш удумліва спасцігаць тую эпоху наогул і паспрабаваць у сваіх пачуццях прайсці той надзвычай складаны і зменлівы шлях, які давялося адолець яму.

— ***Ці цікавіцеся беларускімі літаратурнымі справамі роднай Вам Беласточчыны?***

— Калі дам рады, то я яшчэ падрыхтую зборнік сваіх артыкулаў пра падзеі і літаратуру XX стагоддзя. І ў пачатку будуць змешчаны артыкулы, прысвечаныя Беласточчыне. Бо беларуская літаратура Беласточчыны — з'ява фенаменальная. Працуюць там і пішуць толькі энтузіясты, небывала самаахвярныя і адданыя справе беларушчыны. Я ўпэўнены, што настане пара, калі іх заслугі і ўся дзейнасць будуць належным чынам ацэнены.

— ***З кім Вы найбольш кантактуеце?***

— Былі калісьці кантакты з многімі. Сёння ж сітуацыя такая (і здароўе, і агульнае становішча), што колішнія канкрэтныя сувязі ў асноўным спыняюцца. Але ўсё ж такі не абарваліся з Алесем Барскім, з прафесарам Васілём Белаказовічам. А Віктар Бура з Гайнаўкі прысылае мне ў Мінск цікавыя кніжкі.

— ***Сёння ў Беларусі ўжо існуе два Саюзы пісьменнікаў. Бо Чаргінец падзяліў пісьменнікаў на „чэсных" і „нячэсных", сваіх і чужых. Як Вы пракаментуеце такую сітуацыю?***

— Я інакш усё бачу. Саюз пісьменнікаў разваліўся без удзелу Чаргінца. Бо я сёння рэальна не бачу Саюза пісьменнікаў, які б арганізоўваў нейкія мерапрыемствы, абмеркаванні, збіраў сходы, рабіў нешта рэальнае для творчага жыцця. Ды яшчэ абодва так званыя „саюзы" не маюць свайго гнязда, свайго памяшкання, дзе яны маглі б нешта арганізаваць ці хаця б збіраць членскія ўзносы. Я, калі б і хацеў сустрэцца з тым Чаргінцом, то не ведаў бы, як гэта здзейсніць. Сумна ўсё гэта...

— ***Над чым Вы цяпер працуеце?***

— Толькі што закончыў зборнік твораў Алеся Гаруна для серыі „Школьная бібліятэка". Ён павінен пабачыць свет яшчэ ў гэтым годзе. Зусім нядаўна з'явіўся другі том „Гісторыі беларускай літаратуры XI-XIX стагоддзяў", прысвечаны літаратуры XIX стагоддзя. Там ёсць і мае артыкулы. Жнівеньскі нумар часопіса „Роднае слова" апублікаваў мой матэрыял пра „Слова аб палку Ігаравым", ёсць шэраг і іншых задумак.

Пра айца Яўгена Віхрова і Клаўдзію Бяляеву

Сяргей ЧЫГРЫН

У сёлетнім беластоцкім штомесячніку „Czasopis" (№ 7-8) быў змешчаны артыкул Марыюша Андрайчука „Cerkiew pod lupą bezpieki". Гэты артыкул узяты з магістарскай працы „Праваслаўная царква на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства ў 1944-1956 гадах", якая была абаронена аўтарам у 2005 годзе ў Беластоцкім універсітэце пад кіраўніцтвам прафесара Антона Мірановіча.

У часопісным артыкуле Марыюш Андрайчук згадвае айца Яўгена Віхрова і Клаўдзію Бяляеву. Каб дапоўніць гэты цікавы артыкул, хачу згадаць невялікі, але дужа каштоўны ўспамін пра гэтых людзей майго земляка са Слонімшчыны Барыса Данілюка, які цяпер пражывае ў ЗША. Спадар Данілюк нядаўна мне прыслаў фотаздымкі Віхрова і Бяляевай і згадку пра іх: „У мяне захаваліся здымкі а. Яўгена (на жаль пашкоджаны) і ягонае гаспадыні Бяляевай. Я палічыў, што можа яны табе, Сяргей, прыдадуцца калі". І, сапраўды, прыдаліся. Далей спадар Барыс Данілюк прыпомніў, што яго бацька Хведар Данілюк і а. Яўген Віхроў былі знаёмыя яшчэ да пачатку І сусветнай вайны. У 1931 годзе сям'я Данілюкоў пераехала ў вёску Парэчча Слонімскага павета, а. Яўген у той час працаваў у вёсцы Мяльканавічы. Тады паміж імі завязалася вялікае сяброўства. „Мы два ці тры разы ездзілі ў Мяльканавічы на фэсты і некалькі разоў проста так наведвалі а. Яўгена Віхрова, каб пагутарыць. Час ад часу сустракаліся таксама, калі ездзілі ў Слонім па закупы і затрымліваліся ў „папоўскай" альбо ў „варшаўскай" гасцёўні ў жыда, якога дражнілі „Сучкай". Айцец Яўген быў удавец і меў, здаецца, толькі аднаго дарослага сына, якому пашчасціла сярод амаль суцэльнага безрабоцця ў Польшчы ў тую пару ўладкавацца на службу паліцыянтам у Варшаве. Для хатняе гаспадаркі а. Яўген трымаў хатнюю гаспадыню Клаўдзію Бяляеву, з якою пасябравала мая маці", — успамінае Барыс Данілюк.

Айцец Яўген Віхроў

Клаўдзія Бяляева

У 1934 годзе палякі пачалі сачыць за а. Яўгенам і пасля 1935 года ў Слоніме яго ніхто з Данілюкоў не сустракаў. „Паверыць, што Яўген Віхроў зрабіў нейкія злачынствы падчас нямецкага займа, пэўна ж немагчыма. Што да ягонага выезду ва Усходнюю Прусію ўлетку 1944 года, дык мне круціцца ў галаве хісткі згад, што ён спярша рушыў некуды далей у Нямеччыну, адкуль яго перавезлі ў лагер для праваслаўнага духавенства ў Кустрын (цяпер Костшын-на-Одры), на ўсход ад Берліна, які неўзабаве захапілі савецкія войскі. Ехаць у той лагер прапанавалі і майму бацьку з усёй сям'ёй, але мы цвёрда вырашылі ехаць на паўднёвы захад Нямеччыны, таму катэгарычна адмовіліся", — згадвае спадар Данілюк.

Больш нічога ўспомніць пра праваслаўнага святара Яўгена Віхрова і Клаўдзію Бяляеву ён не змог. Спадар Данілюк даслаў і гэтыя фотаздымкі, якія прапаную чытачам „Нівы". Яны зробленыя ў 1932 годзе.

„Мы будзем тут заўсёды!”

Віктар САЗОНАЎ

Дзень памяці паўстанцаў 1863-64-х гадоў, які штогод праходзіць у Свіслачы, што на Гродзеншчыне, гэтым разам ладзіўся ўжо трынаццаты раз. Па ўсталяванай традыцыі ў апошнія выхадныя кастрычніка патрыёты з розных куткоў Беларусі прыязджаюць у невялічкі раённы цэнтр, каб на ўскрайку Белавежскай пушчы аддаць даніну павагі тым, хто паклаў сваё жыццё за вольную Бацькаўшчыну. Бо не можа той народ рабіць будучыню, які не ведае і не шануе мінулага. Бо нельга пабудаваць трывалыя сцены Беларускай Дзяржавы, не абапіраючыся на каменныя падмуркі, якія збудавалі Героі мінулага.

Толькі, на вялікі жаль, як і раней, у часы няволі і знішчэння беларускасці, не ўсім да спадобы намаганні патрыётаў. Нібыта нічога не змянілася. Нібыта не было тых доўгіх стагоддзяў змагання, здабыткаў БНР на пачатку дваццатага стагоддзя, аднаўлення незалежнасці ў яго канцы...

Гродна

Заказаны аўтобус не прыйшоў своечасова. Гродзенцы, якія сабраліся ехаць у Свіслач, пачалі шукаць іншыя варыянты. Але, нарэшце, аўтобус з'явіўся. Разам з міліцыяй. Палкоўнік папярэджвае ўсіх пра адказнасць. Пагражае, што калі несанкцыянаванае мерапрыемства пачнецца, міліцыя вымушана будзе „прыняць меры”. Яму тлумачаць, што наведванне могілкаў не патрабуе дазволу ўладаў і санкцый. Ён усё і так ведае. І што напярэдадні Уладзіміру Хільмановічу ўжо прынеслі дахаты павестку з'явіцца ў міліцыю акурат тады, калі будзе ад'язджаць аўтобус на Свіслач, і што міліцыя прыходзіла дахаты і да Віктара Сазонава, і да Вадзіма Саранчукова... І што Анатоль Валюк у Свіслачы ўжо сядзіць на сутках... І што іншых свіслацкіх актывістаў таксама не „абышла ўвагай” міліцыя... Усё ведае. Але загад ёсць загад. Трэба не дазволіць людзям ушанаваць памяць палеглых за Бацькаўшчыну...

Ля Свіслачы зноў аўтобус спыняе міліцыя. Аператар здымае на камеру ўсіх прысутных. Начальнік свіслацкай міліцыі зноў папярэджвае. Даводзіць да ўсіх, што міліцыя ўвесь час будзе суправаджаць гасцей яго горада, і пешшу і на машыне. Аўтобус экіпіраванага АМАПу чакае загаду...

Мінск

Аўтобус з мінскімі патрыётамі затрымалі праз паўгадзіны пасля выезду. Пасажыраў перапісалі. Строга папярэдзілі... Мінчукі ўжо бачаць, што на паніхіду па палеглых Героях яны спазніліся. Але і далей імкнуцца патрапіць у Свіслач. У Баранавічах аўтобус зноў спыняюць. Міліцыя шукае... гарэлку і...наркотыкі. Віктар Івашкевіч і Юры Хадака стараюцца вытлумачыць міліцыянтам, што тут не той кантынгент людзей, якія на могілкі едуць весяліцца. Міліцыянтам усё роўна. Яны ўсё разумеюць, але робяць сваю справу. Мінчукі ўцямілі, што аўтобус у Свіслач не даедзе...

Свіслач

Тыя, хто змог даехаць, на аўтобусе ці легкавіком, людзі з розных куткоў Беларусі, схілілі свае галовы ля магілы Віктара Каліноўскага. Уладзімір Хільмановіч прапанаваў ушанаваць памяць палеглых за Бацькаўшчыну хвілінай маўчання. Чутна, як восеньскія дрэвы плачуць жоўтым лісцем па нявінна закатаваных беларусах... Вечная памяць Героям!

Затым Якушоўка. Ля падмуркаў былой сядзібы Каліноўскіх выступаюць прамоўцы. Тут і Станіслаў Шушкевіч, і Вінцук Вячорка і іншыя лідэры апазіцыі. На вопратцы прысутных бел-чырвона-белыя стужкі. На наяўнасць міліцыі і відэакамеры ніхто не звяртае ўвагі. Твары ў людзей рашучыя і ўрачыстыя. „Мы завершым тое, што не далі дарабіць беларускім Героям мінулых часоў” — кажуць яны. — „Вечная слава Героям!” Ля раней пастаўленага ў гонар палеглых за Радзіму Герояў крыжа садзіцца дубовая алея — сімвал моцы і нязломнага духу.

Пасля зноў Свіслач. „Расейскія ўлады дамагаліся, каб Кастусь Каліноўскі выракся беларускасці. Яму абяцалі жыццё ўзамен таго, каб ён назваў сябе палякам. Бо акупанты хацелі, каб не было нават памяці пра беларускае паўстанне. Хацелі сказіць праўду і назваць яго польскім. Бо ведалі — калі ў беларусаў застанецца памяць, то яны ўсядно здабудуць незалежнасць. Ведаў гэта і Кастусь. І ў свае юнацкія гады аддаў жыццё за Беларусь і не зрокся беларускасці”, — сказаў Сяргей Мальчык. Загарэліся ля помнікаў Каліноўскага і Траўгута знічкі. Ляглі бел-чырвона-белыя букеты кветак.

Пасля лес і вогнішча. І патрыятычныя песні беларускага барда Андрэя Мельнікава. Сюды на таксоўках з Баранавічаў даехала мінская моладзь, у аўтобусе якіх штосьці „шукала” міліцыя. „Мы будзем прыязджаць сюды штогод”, — кажуць прысутныя. — „Мы не спалохаемся. Мы даробім тое, за што аддалі свае жыцці лепшыя сыны і дочкі беларускай нацыі. Вечная памяць Героям. Слава Героям!!!”.

http://www.mastlit.by

Беларусы спрадвеку славіліся сваёй любоўю да кніг і павагай да кнігадрукавання. Нездарма першым усходнеславянскім друкаром у XVI стагоддзі стаў палачанін Францыск Скарына і нездарма вучыцца друкаванню ў Вялікае княства Літоўскае з суседняй Масковіі прыязджаў тамтэйшы першадрукар Іван Фёдараў.

Сёння ў Беларусі, у адрозненні ад савецкіх часоў, існуе мноства друкарняў і выдавецтваў. Адзіная праблема — беларускамоўнай літаратуры на паліцах магазінаў практычна няма. Яны заваленыя рускамоўнымі жаночымі раманамі і бульварным чытвом. Вядома, большасць іх прывозяць з Расіі, але і свае выдавецтвы не імкнуцца прапаноўваць айчыннаму чытачу кнігі на роднай мове, бо фінансава гэта зусім немэтазгодна.

Тым не менш сёе-тое па-беларуску выходзіць і цяпер. Адным з такіх выдавецтваў, якія друкуюць беларускамоўную літаратуру ёсць „Мастацкая літаратура”. Да яго, а дакладней на яго сайт, мы сёння і завітаем.

Каб выйсці да віртуальнага прадстаўніцтва „Мастацкай літаратуры”, трэба набраць на сваім камп'ютэры адрас http://www.mastlit.by. Перад намі адкрыецца вельмі сціплае, выкананае ў сіне-блакітных танах выяўленне. Уверсе месціцца эмблема выдавецтва і яго назва. Ніжэй — рубрыкі, якіх толькі чатыры, а яшчэ ніжэй — камерцыйная прапанова тых выданняў, якія пабачылі свет, выйшаўшы па замове „Мастацкай літаратуры”.

Больш цікавай ёсць наступная старонка, якая коратка распавядае пра гісторыю выдавецтва (дарэчы, яна так і называецца „Аб выдавецтве”): „Выдавецтва «Мастацкая літаратура» заснавана ў 1972 годзе на базе рэдакцый мастацкай і дзіцячай літаратуры выдавецтва «Беларусь». Выпускае арыгінальныя творы пісьменнікаў Беларусі на беларускай, рускай і замежных мовах, кнігі па літаратуразнаўстве і крытыцы, творы замежных пісьменнікаў у перакладзе на беларускую мову, зборы твораў і выбраныя творы, літаратурную спадчыну, дакументы, публіцыстычную і юрыдычную літаратуру. У 2002 годзе аб'яднана з выдавецтвам «Юнацтва» і цяпер таксама выдае творы для дзяцей. Мае выдавецкія серыі «Дэбют», «Скарбы сусветнай літаратуры», «Беларуская проза XX стагоддзя», «Беларусь літаратурная», «Бібліятэка прыгод і фантастыкі», «Зямля мая», «Беларусь мастацкая», «Беларускі народны каляндар», «Жыццяпіс вялікіх князёў Беларусі», «Беларускі фальклор», «Казка за казкай»”

Сапраўды, такім пералікам літаратуры пра Беларусь можа пахваліцца далёка не кожнае выдавецтва. З таго больш цікавей перайсці да наступнай рубрыкі, якая абазначана як „Каталог” і дзе месціцца не толькі назвы кніг, але і іх выявы з невялікімі анатацыямі.

Дарэчы, уласна пералік выйшаўшых у выдавецтве кніг (па меншай меры тых, што прадстаўленыя ў „Каталозе”) вядзецца толькі ад ліпеня бягучага года. Пэўна, гэта звязана з тым, што сайт з'явіўся зусім нядаўна.

Калі праглядзець тыя кнігі, якія выдала „Мастацкая літаратура” за чатыры апошнія месяцы, то пераважная большасць з іх — беларускамоўныя і вартыя павагі. Напрыклад, творы Уладзіслава Галубка, Якуба Коласа, Уладзіміра Караткевіча ці Міколы Гусоўскага. У жніўні свет пабачылі кнігі Алеся Камоцкага, Алаізы Ажэшкі, Юзафа Крашэўскага.

Прыемна, што „Мастацкая літаратура” не забываецца аб маленькіх беларусах, прапаноўваючы ім адпаведныя ўзросту беларускамоўныя выданні.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Кастрычніцкія рахункі

Хутка прамінуў яшчэ адзін месяц восені, значыць, прыйшла пара „падбіць” яго рахункі і падсумаваць пазітыўныя вынікі. Спартовы кастрычнік 2007 года адышоў у гісторыю, тады адлюструем яго ў традыцыйным ніўскім аглядзе.

1. Сяргей Мартынаў (кулявая стральба) перамог у фінале Кубка свету, які праходзіў у сталіцы Тайланда. У Бангкоку ён стаў лепшым у стральбе з малакаліберная вінтоўкі лежачы з адлегласці 50 метраў.

2. Юрый Раманаў (бокс) паспяхова абараніў тытул чэмпіёна Еўропы ў лёгкай вазе сярод прафесіяналаў — ён адолеў грознага Стэфана Дзофа з Італіі, які шмат разоў быў чэмпіёнам кантынента ў аматарскім боксе.

3. Уладзімір Самсонаў (настольны тэніс) спярша на Кубку свету трапіў у васьмёрку мацнейшых, а пасля выйшаў у фінал Суперкубка Еўропы, што праходзіў у сталіцы Татарстана Казані і сабраў восем мацнейшых кантынентальных майстроў малой ракеткі. У абодвух турнірах Самсонаў саступаў свайму адвечнаму саперніку — немцу Ціму Болю.

4. Аляксандр Вахавяк (самба) стаў галоўным лаўрэатам на этапе Кубка свету, што праходзіў у Маскве. Заўважым, што ўсяго на гэтым турніры беларусы здабылі 7 медалёў рознай вартасці.

5. Юрый Рыбак (дзюдо) стаў мацнейшым на этапе Кубка свету ў Баку ў суперцяжкай вагавай катэгорыі. У сталіцы Азербайджана, праўда, не выступалі некаторыя моцныя атлеты.

1. Кацярына Мурашка і **Аліна Юшко** (спартовая акрабатыка) сталі віцэ-чэмпіёнкамі свету — у Нідэрландах гомельскія дзяўчаты ўзялі важкае срэбра ў такой складанай дысцыпліне.

2. Кацярына Пракапенка (самба) на згаданым этапе Кубка свету святкавала першынство ў катэгорыі да 60 кг.

3. Вікторыя Азаранка (тэніс) спярша дайшла да фіналу турніру серыі СТА, які праходзіў у Ташкенце, потым перамагла Марыю Шарапаву ў розыгрышы Кубка Крамля. Там жа, у пары з Таццянай Пучак, Віка дайшла да фіналу.

4. Вольга Лешчанка ў катэгорыі да 48 кг, а **Кацярына Радзевіч** у катэгорыі да 72 кг на этапе Кубка свету па самба былі ўзнагароджаны срэбрам.

5. Юлія Барысік (дзюдо) на этапе Кубка свету, які праходзіў дома ў Мінску, стала бронзавай прызёркай.

Камандавым дасягненнем нумар адзін, канешне, стала бронза жаночай баскетбольнай дружыны на чэмпіянаце Еўропы — пра гэты неверагодны поспех мы падрабязна пісалі. З іншых калектываў варта вылучыць чэмпіёна краіны па валейболе — мужчынскі магілёўскі „Металург”, які прайшоў другі раунд Кубка выкліку. Саступіўшы ў гасцях 0:3 фінскаму клубу „Пііволей”, магілёўцы дома ўзялі рэванш — 3:2, а пасля вырвалі і дадатковую „залатую партыю”. Вызначыўся таксама беларускі мікст-дуэт па акрабатыцы — пара Анастасія Жарнасек і Сяргей Быхаўцаў стала „бронзавай” на чэмпіянаце Еўропы па акрабатыцы.

А мужчынская гандбольная зборная, якой кіраваў Аляксандр Каршакевіч, стала пераможцам міжнароднага турніру „Samsung-Cup”, які прайшоў у аўстрыйскім Інсбруку. Нашы хлопцы ўпэўнена разабраліся з грэкамі і фінамі, а ў фінале ўзялі верх над гаспадарамі пляцоўкі — 35:33. І нарэшце на камандавым першынстве Старога свету па дзюдо, якое прайшло ў Мінску, нашы хлопцы і дзяўчаты занялі трэція месцы п'едэстала.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Лёс металічнага гулякі

Вось малочны бітон, які красуецца ў адной з вёсак паблізу геаграфічнага цэнтра Еўропы. Што можна сказаць пра гэты, здавалася б, стары кусок каляровага металу? Пра гэтую пасудзіну, якая ў нашай культуры лічыцца звычайным прадметам? Пытанне, ці гэтая рэч мае душу, у абставінах, калі шматлікія філосафы адмаўляюць яе нават жывотным, лічу чыста рытарычным з нашага пункту гледжання. Але калі б мы ўсё ж такі памыляліся, калі б гэты бітон у сюрпрыз нам аказаўся асобай, не толькі з целам, але і з душой, на дадатак багатай душой з разнаколерным веерам усіх пачуццяў, з пералівамі мікраэлектронных зарадаў у ягоных металічных нейронах... Ён бы нам расказаў пра сваё, магчыма, шматпакутнае жыццё.

Бо патэнцыяльная душа ў гэтага стварэння або рук чалавечых, або ліцейных машын, як гэта паказвае ягонае выяўленне, не магла быць іншай, чым рагатая. Калі б ён быў адно бязвольнай металічнай адліўкай, хто б яго занявольваў у жалезную дыбу, на дадатак прывязваючы кайданным ланцугом? Выстаўляючы на дождж, вецер, мароз, град ды ўсялякія чалавечыя патуранні? І на сабачыя...

Але гэтая доля старога прадмета — як бы мы гэта сказалі, — здаецца быць невыпадковай. Спрабуйма заглянуць у мінулае нашага таемнага героя, у ягоную маладосць, і пагляньма, ці яна была дастойная жыцця ў сённяшніх агіографаў, ці — менавіта — такога рабскага ланцуга. Але насамперш — у дзяцінства.

У гэты шчаслівы перыяд наш бітончык прыстойненька папіваў адно малако, і то свежанькае, не скажонае ніякай нездаровай ферментацыяй. У той шчаслівы перыяд усё rosło w siłę, a ludzie żyli dostatniej; і наш любімчык таксама. Правёўшы такі ўзорна здаровы лад жыцця, стаў ён буяністым маладзёнам з бліскучым вонкавым выглядам. І тады перад ім сталі шырока раскрывацца ўсе спакусы бітоннага жыцця, як перад працавітай пчолкай кветкі на веснавым лузе. І наш герой кінуўся на шырокія хвалі новага жыцця. Спярша, вяртаючыся з пункту прыёму сырадою, калі ягоныя гладкія вусы толькі што сталі абсыхаць ад малака, ён ужо на возе стаў чубіцца са спадарожнічаючымі бітончыцамі, узнімаючы пры гэтым такі рогат, такі гоман, што аж конь палохаўся. Мала гэтага, ён не толькі шальмавата падшчыпваў сваіх сяброўак, але яшчэ стаў даказваць больш, громка качаючыся з імі па возе, часам нават стараючыся выскачыць з таго воза ў прыдарожныя кусты...

Калі ўвялі ў нашай найлюбімейшай краіне талоны не толькі на муку і ўсялякую іншую сухавіну, але і на найбольш эмацыянальныя напоі, нашага ўжо бамбізу сталі прыцягваць не адно спакусы, але і людзі да сваіх не надта законных інтарэсаў. Забіралі яго тады ў старонняе месца, найчасцей у лес, дзе мужчыны вялі свае мужчынскія бізнесы. І не шкадавалі яму першачку, так што мог набірацца яго да адвалу. І тады, безуладнага ўжо, тыя дабрадзеі валаклі і хавалі яго ў нейкае адлюднае месца — ці то ў салому, сена, а то нават у зямлю ўвальвалі, дзе пэцкаўся ён як звычайная свіння. Але ж горкія п'яніцы ў нас — як тыя лысыя коні, што свой да свайго цягне. Гэтак і нашага бітанюгу выцягвалі з нагоды важных святаў, абчышчалі, стаўлялі нават за стол, дзе ён выконваў найгалоўную ролю — напаўняў не кілішкавую драбязу, але найбуйнейшыя бутэлькі.

Але колькі ж можа пацягнуць гарэлкі не толькі найбольш спрактыкаваны чалавек, але і звычайны бітон? Як гавораць нашы старэйшыя браты-славяне — усёй гарэлкі не перап'еш. Гэтак жа стаў выходзіць са строю і наш герой. І да такога занядужалага страцілі цікавасць усе, нават дабрачынныя арганізацыі адвярнуліся ад старога бітона спіной. А маглі б жа яго забраць у нейкі прытулак, на звалку для састарэлага каляровага металалому, дзе б можа былі іншыя ці то бітончыцы, ці конаўкі, ці вёдры, ці нават звычайныя кубкі. То ж з імі можна было б пагутарыць, а было б пра што. Ці то пра вясёлыя і сумныя эпізоды са службы дагаджання людскім вуснам, ці то пра хваробы і лячэнне ад іх — малатком ад розных вывіхаў, вадкасцю маркі „Ludwik" ад забруджанняў ды іншымі катаваннямі ад іншых хвароб.

А тут — у геаграфічным цэнтры Еўропы, у XXI стагоддзі — распялі старэчу на адмысловых дваянах, быццам на чартоўскіх вілах, быццам у пекла кінулі. І людзі знуткуюцца быццам самыя чэрці. Кідаюць час ад часу такія смуроды, што аж дыхнуць няма як. Часам нехта банку з-пад піва кіне, і то пустую — пахне-пахне, а ні капелька залацістая не капне наталіць прагу. А хочацца вельмі... Мо тыя нелюдзі на дзвюх нагах думаюць, што старому нельга даваць алкаголю, што шкодны ён... **(івар)**

Гэта проста скандал!

Уладзімір СІДАРУК

Аб хібах Прадпрыемства пасажырскай перавозкі ў Беластоку неаднойчы пісала „Ніва" (чытай „Калі гэта скончыцца?", № 43 ад 28 кастрычніка 2007 г.). Сёння іншы прыклад. У нядзелю, 28 кастрычніка, рашыў я паехаць у Высокае. Купіў білет на цягнік, які ад'язджае з Чаромхі ў 17^{22}. Рэйкавы аўтобус быў падстаўлены, пачыналася падсадка. Гэтым цягнікам апрача чаромхаўскіх „мурашак" падарожнічалі турысты з Беларусі. Пашпартна-мытны кантроль закончыўся тэрмінова. Паводле вайскоўцаў пагранічнай аховы ў аўтобусе знаходзіліся 54 асобы, у гэтым ліку 23 школьнікі, якія ўдзельнічалі ў спаборніцтвах па плаванні ў Бельску-Падляшскім і вярталіся ў Брэст. Калі прыйшоў час адпраўлення цягніка, выявілася, што цягнік папсаваўся. Колькі машыніст ні намагаўся выправіць загану, аднак не атрымалася. Канчаткова заявіў ён дыспетчару паравознага дэпо, што трэба зварыць нейкую частку матора. Паступіла каманда пагранічніка: здаць пашпарты, выходзіць на перон. На пытанні падарожных пагранічнік адказаў: „Паедзеце на іншым аўтобусе". Была гадзіна 17^{40}. Станцыённыя мегафоны маўчалі. Аб прычыне аварыі, як і прыбліжаным часе ад'езду цягніка ў Высокае ніхто не сказаў слова. Толькі сярод чаромхаўскіх „мурашак" пачуў я такую гаворку: „Гэта не першы раз здараецца. Штосьці падобнае было ў чацвер. Паехалі перад сёмай". Апрача школьнай групы з Беларусі падарожнічала каля дзесяці жанчын, якія таксама падаваліся ў Брэст. Паколькі спазненне цягніка працягвалася, а апошні цягнік з Высокага ў Брэст адпраўляўся ў 18^{30}, дык усе яны нервова паглядалі на гадзіннікі. Чаромхаўскія пагранічнікі патэлефанавалі ў Высокае і паведамілі аб аварыі цягніка, ды папрасілі затрымаць дызель у Брэст да моманту прыезду поезда з Чаромхі, але пачулі адказ, што гэта немагчыма. Падарожным прад'явілі, што паедуць рэйкавым аўтобусам, які прыедзе з Беластока перад васемнаццатай гадзінай (паводле раскладу язды прыязджае ў Чаромху ў 17^{52}). Але і тут выявілася асечка. Набліжалася 18 гадзіна, а цягніка з Беластока ні слыху, ні духу. Адно касірша білетнай касы заявіла, што цягнік з Беластока прыязджае не ў 17^{52} толькі ў 18^{07} (аб гэтай перамене ніякіх паведамленняў на чаромхаўскай станцыі няма, ды інфармацыйныя службы маўчалі быццам вады ў рот набраўшы).

Адправіліся мы ў Высокае амаль з паўтарагадзінным спазненнем, калі раз'ехаліся цягнікі ў напрамку Варшавы і Гайнаўкі (абодва спазняліся каля пятнаццаці мінут). У час падарожжа беларускія турысты прад'яўлялі шмат заўваг у адрас польскай чыгункі, але, памойму, гэта агульнавядомая вада на млын, бо Прадпрыемства рэгіянальнай перавозкі ў Беластоку не дбае пра сваю рэпутацыю. Выкупленне білета ў касе гэта заключэнне дагавору паміж пасажырам і перавозчыкам. Тэарэтычна гэта абазначае, што перавозчык гарантуе падарожнаму бяспечны і тэрміновы праезд. За нестрыманне дамовы перавозчык абавязаны заплаціць кампенсацыю за затраты, якія кліент набавіўся ў час падарожжа. У гэтым выпадку такой кампенсацыі маглі б патрабаваць турысты з Брэста. І маё тут пытанне: ці была прычына, каб затрымаць на больш чым дваццаць мінут міжнародны цягнік з 54 пасажырамі дзеля таго, каб прапусціць цягнік у Гайнаўку? За гэты час можна было даехаць у Высокае. Адно можна сказаць — няма супрацоўніцтва паміж прадпрыемствам „Cargo S.A." і Прадпрыемствам рэгіянальнай перавозкі ў Беластоку.

Адгаданка

1	2					3						
		4		5			6					
									7			
											8	

1. орган нюху, 2. падраздзяленне кавалерыі ў сіле пяхотнай роты, 3. карандаш, 4. частка сушы акружаная з усіх бакоў вадой, 5. парусная лодка, 6. невядомае, непазнанае, 7. сталовая пасуда або ўдарны музычны інструмент, 8. савецкае акрэсленне прадстаўніка санацыйнай Польшчы.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — прыказка. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 40 нумара
Вы, Кіеў, кныр, Морзе.
Рашэнне: **Кроў не змые крыві.**
Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2008 r. upływa 5 grudnia 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2008 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 650 egz.

Чаго баяцца? — у Нараўцы

Міра ЛУКША

Чаго баімся? — спыталася рукаводжаная Станіславам Загурскім ломжынская „Стопка", рыхтуючы чарговы мастацкі пленэр, — успамінаў быў куратар пленэра ў Семяноўцы Анджэй Струміла. — Як заўжды смелая і інтэлектуальна правакатарская праграма пераказана ўдзельнікамі метафарай, сімвалам, персаніфікуючы зло або паказваючы яго вынікі. Рэшта смакавала навакольны пейзаж, або засталася пры сваіх звычаях і манерах. Нараўчанскай гміне належыцца прызнанне за ініцыятыву, актыўнасць і гасцінасць.

Пленэр праводзіўся летам (25.06. — 5.07.2007 г.) у Семяноўцы, у будынку былой пачатковай школы, цяпер Асяродку экалагічнай адукацыі, у якой адбываюцца вельмі цікавыя культурныя і адукацыйныя падзеі, дзякуючы якім старэючая вёска перажывае новую маладосць. Удзельнікі праекта — 31 мастак з Польшчы і Беларусі — азнаёміліся таксама з праблемамі Белавежскай пушчы і аколіц, азнаёміліся з традыцыйнай культурай рэгіёна, з жыхарамі і іх верай.

— Пазнаёміцца — перастаць баяцца, — тлумачыў пасля „добры дух пленэра" і выставы (адкрыццё 26.10.) Віктар Кабац, які найчасцей пражывае ў сваёй зямлянцы ва ўрочышчы Марушка непадалёк Семяноўскага вадасховішча.

— Чаго баімся? — пытаецца Анджэй Струміла, які прадбачвае наступныя кантакты з гэтым месцам і людзьмі, — Баімся таго чагосьці, што над намі, таго агромнага, багатага з'явамі, а што здаецца нам жорстка абыякавым да нашых лёсаў, да ўсяго чалавецтва. Зорнае неба, холад сусвету, і мы — маленькія. Ды неба дае нам духовую моц. Мастацтва ж з'яўляецца адным з важнейшых актаў на гэтым шляху. Баімся Натуры. Баімся невядомага. Зло ўяўленае і прадстаўленае можа паддавацца замовам і знішчэнню.

Тое Зло персаніфікуецца на карцінах і на рэзьбах з драўніны і палявога каменя як выявы д'яблавых лікаў, як маска крывадушніка, задратаваныя твары прыбітых людзей, „краіна ў кратах". Большасць аднак мастакоў захапілася колерам і святлом акаляючага месца, і на іх карцінах заквітнелі выявы наднарваўскага краявіду, асацыяцыі са святымі, добрымі людзьмі пад апекай „святых Георгіяў і Ежых". І павіслі яны, творы, на сценах былой нараўчанскай драўлянай школы, цяпер Галерэі імя Тамары Саланевіч, і застануцца тут. У падзяцы за старанне за родную культуру Грамадскае прэсазнаўчае згуртаванне „Стопка" ўзнагародзіла пару днямі раней войта Нараўчанскай гміны Міколу Павільча медалём Зыгмунта Глогера ў XVIII выданні гэтай адзнакі. Гэтая ўзнагарода назначаецца за асаблівыя дасягненні ў даследаванні, захоўванні і развою культуры.

— У Польшчы бачыцца старанне войта Міколы Павільча за дакладванне сваёй рукі да развою культуры, падтрымку моладзі і калектываў, за ініцыятыву ўзнікнення цэнтра імя Тамары Саланевіч.

Фота Міры ЛУКШЫ

Грамадскае прэсазнаўчае згуртаванне „Стопка" ўзнагародзіла войта Нараўчанскай гміны Міколу Павільча медалём Зыгмунта Глогера

— Я вельмі ўсхваляваны і рады гэтай узнагародзе, якая не толькі для мяне, але для ўсяе гміны, — сказаў войт. — Запрашаю вас на пасляпленэрную выставу, якой загаловак — „Чаго баімся", вельмі шматзначны. На карцінах увекавечана таксама наша тэрыторыя, людзі. Мы вельмі рады, што наша мерапрыемства было прыкмечана і дацэнена. Гэта ўжо набытак нашай гміны. А таксама і прамоцыя. Тым больш, што падтрымалі нас такія вялікія людзі, як м.інш. Анджэй Струміла.

Фота Міры ЛУКШЫ

Станіслаў Загурскі, старшыня „Стопкі":

— Пыталіся ў нас, чаму мы так палюбілі Нараўку. Вось таксама і з-за Галерэі імя Тамары Саланевіч. Мне гэтая асоба вельмі блізкая. Працаваў я з ёю ў Варшаве, і ў Беластоку. Гэта была цудоўная, моцная духам асоба. Бывае, што ходзяць за намі тыя асобы, якія ўжо адышлі, а надалей застаюцца з намі, у нас. Мне цяпер Нараўка асацыюецца і з войтам, з яго стараннем, з яго пачуццём , што апынуўся ў месцы, з якім звязаны назаўжды, з якога не трэба ўцякаць, каб быць блізка свету. З такога месца, дзе чалавек карыстаецца каштоўнасцямі прыроды, але і ажыўляе свой розум, свае памкненні. Думаю, што нашы кантакты не парвуцца, бо людзі актыўныя шукаюць сабе падобных. Чалавек даспявае, набывае багацця, знаёмячыся з іншымі, дакранаючыся да шматкультурнасці. Без боязі.

— Гэтая выстава, і ўвогуле дзейнасць і галерэі, і войта, і асоб згуртаваных вакол таго, каб захаваць родную культуру, сведчыць аб тым, што — „Жыве Нараўка!" — не скрываў свайго энтузіязму Янка Целушэцкі, адзін з заўзятараў грамадскай дзейнасці, якіх шмат паявілася на адкрыцці пасляпленэрнай выставы.

Выстава пастаянна адкрыта ў Галерэі імя Тарамы Саланевіч у Нараўцы, па вул. Міцкевіча 50, дзе знаходзяцца таксама пастаянныя экспазіцыі, м.інш., народных умельстваў жыхароў Нараўчанскай гміны.

Фота Міры ЛУКШЫ

11.11 – 17.11

Баран (22.03. — 20.04.) Знакаміта ў кампаніі. У каханні ўсё пойдзе так маланкава, што не агледзішся, як не будзеш магчы жыць без гэтай асобы. З сябрамі можаш не дагаварыцца як след. Дбай аб здароўе.

Бык (21.04. — 21.05.) Поспехі дзякуючы ўласнай кампетэнтнасці і зычлівасці іншых. На працы матывіроўка значнага заробку. Новы раздзел у жыцці ў пары. З 16.11. раны на душы пачнуць залечвацца самі.

Блізняты (22.05. — 22.06.) Калі ты сінгель, пачнуць бачыць цябе ў дуэце. Падтрымка найбліжэйшых асоб. Выкарыстаеш усе нагоды каб дарабіцца! Можаш кінуць урэшце курыць!

Рак (23.06. — 23.07.) З 15.11. вялікія поспехі ў навуцы. Дзякуючы выездам маеш шанц на небанальнае каханне. Вялікая апека сяброў. Будзь творчы і адважны, не адгонішся ад знакамітых прапаноў.

Леў (24.07. — 23.08.) Неспакой. Няшчырасць, мана і расчараванне могуць папсаваць адносіны з каханай асобай. Лепшыя грошы за добрую работу.

Дзева (24.08. — 23.09.) Да 14.11. магчымыя прыкрасці, нават знявага (могуць на цябе нагаварыць кіраўніку). Добрыя адносіны з сям'ёй, асабліва з бацькам. Займіся спортам, перш за ўсё з сябрамі, выціскай тлушч! Паправа жыццёвага ўзроўню. Можаш атрымаць дадатковую працу.

Шалі (24.09. — 23.10.) Забудзешся аб прыкрасцях, жыццё поўнае красы, жарсцяў. Пераканаешся, што наўкол цябе шмат сяброў. Глядзі наперад, не думай пра былое. Неблагая фізічная форма, хоць ты не вулкан энергіі.

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Прарвешся з кожным праектам. Уключышся ў вір актуальных падзей. Думаеш цвяроза, хутка дзейнічаеш, нішто не ўцячэ ад тваіх вачэй! Акалічнасці спрыяюць хуткім жыццёвым зменам. Шмат прафесійных поспехаў.

Стралец (23.11. — 22.12.) Можаш на хвілю страціць пачуццё бяспекі, разгубіцца. На працы не ўсё ўдасца, некаторыя людзі спецыяльна схочуць табе зашкодзіць. Гавары ясна і адкрыта, не бойся, што хтосьці абразіцца. Вучыся гаспадарлівасці.

Казярог (23.12. — 20.01.) Час на размовы, негацыяцыі, сур'ёзныя пакупкі, інвестыцыі. 13-17.11. старайся ўступаць іншым; калі ўпрэшся на сваім, можаш страціць каханую асобу ці адданага сябра.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Будуць турбаваць цябе некаторыя рэчы ў партнёра, можаш баяцца за вашу будучыню. Сур'ёзныя змены ў пачуццёвым жыцці. Адпачывай сярод сваіх фантастычных сяброў.

Рыбы (20.02. — 21.03.) Знакаміты час пачаць падарожжа. 10-14.11. прадвяшчаюцца страты і сур'ёзныя расчараванні. Могуць цябе ўвесці ў зман крутыя асобы. Чакае цябе такое палымянае каханне, што можаш страціць пачуццё рэальнасці.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960